Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

КРАСАВІК 11 1933 г. № 80 (4624)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ! ПЕРАДАВЫ—Посьпех сяўбы вырашаецца ў брыгадзе.

АБ РАБОЦЕ ВУГОЛЬНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ ДАНБАСУ — Пастанова СНК Саюзу ССР і ЦК УсеКП(б) (2 стар.).

Аб сучасным становішчы ў Германіі. (2 стар.).

Множыць рады ўдарнікаў каапэрацыі! (3 стар.).

Лісты рабселькораў (3 стар.).

ЗА МЯЖОЙ:

Мусаліні выказваецца за рэвізію граніц (4 стар.).

Масавыя вобыскі і арышты ў сувязі з 1 маем (4 стар.).

12-дзённая галадоўка палітзьняволеных Львоўскай турмы (4 стар.).

За нашэньне камуністычнага значка—9 месяцаў турмы.

УМАЦУЕМ КАЛГАСНЫЯ БРЫГАДЫ!

БАЛЬШАВІЦКАЙ АРГАНІЗАЦЫЯЙ РАБОТЫ ПАСТАЯННЫХ ВЫТВОРЧЫХ БРЫГАД КАЛГАСАЎ ЗАБЯСЬПЕЧЫМ ПЕРАМОГУ НА ПАСЕЎНЫМ ФРОНЦЕ, КОЖНАМУ КАЛГАСУ-ВЫРАЗНЫ ПЛЯН!

ПОСЬПЕХ СЯЎБЫ ВЫРАШАЕЦЦА У БРЫГАДЗЕ

Масавая сяўба — на парозе. Пахаладаньне, якое ахапіла рад раёнаў — не адтэрміноўка. Дораг кожны дзень, кожная хвіліна. Гэтай ісьціны нашы многія партыйныя арганізацыі не зразумелі аднак і цяпер. Шмат гутарак, шмат абяцаньняў, шмат самых прыгожых дэклярацый і мала, злачынна мала сапраўды творчай напружанай работы.

Хіба можна сказаць, што наша рэспубліка сустракае масавую сяўбу ў поўнай баявой гатоўнасьці? Не. Гэта было-б самым шкодным, самым небясьпечным самасупакоем. Наадварот. Першыя дні палявых работ яркa паказваюць, наколькі ў цэлым радзе месц у нашых партарганізацый, у нашых зямельных органаў словы разыходзяцца са справай.

Возьмем адно канкрэтнае і самае **ГАЛОЎНАЕ** пытаньне — пытаньне аб вытворчых плянах і пастаянных брыгадах у калгасах. Хіба ня ясна, што бяз пляну, правільна складзенага, дакладна распрацаванага, ні адзін калгас ня зможа сваячасова і з посьпехам засеяць яравы клін. Хіба ня ясна, што без такога пляну ні адзін калгас ня зможа выразна арганізаваць сваю вытворчасьць, выразна і правільна расставіць свае сілы на пасеўным фронце.

«Калгас, — гаварыў правадыр нашай партыі тав. Сталін, — ёсьць буйная гаспадарка. Але буйная гаспадарка ў зямляробстве, якая ахапляе сотні, а іншы раз і тысячы двароў, можа весьціся толькі ў парадку плянавага кіраўніцтва. Бяз гэтага яна павінна загінуць і разваліцца».

Вытворчы плян без пастаянных вытворчых брыгад—пустая фармальнасьць. Пастаянныя вытворчыя брыгады павінны быць у кожным калгасе, які яднае звыш 15 гаспадарак.

Што вырашае посьпех сяўбы, як не пастаянныя вытворчыя брыгады? У чыіх руках, як не ў руках брыгад лёс ураджаяў нашых калгасных палёў? Нельга добра апрацаваць глебу і поўнасьцю засеяць яравы клін, нельга дабіцца высокіх ураджаяў, калі не ўмацавана аспоўнае звяно калгаснай вытворчасьці — пастаянная вытворчая брыгада.

Як выконваюцца дырэктывы СНК і ЦК аб складаньні вытворча-фінансавых плянаў і арганізацыі пастаянных вытворчых брыгад у калгасах?

Са ўсёй рашучасьцю трэба сказаць, што тут, на гэтым рашаючым вучастку мы ганебна адсталі. Яшчэ і цяпер, перад масавай сяўбой, у нас куды больш агульных разважаньняў, чым правільна складзеных і арганізаваных вытворчых брыгад, чым выразных калгасных плянаў.

Мала таго, што складаньне плянаў і арганізацыя пастаянных вытворчых брыгад недапушчальна зацягнуліся. У самой гэтай справе дапускаюцца грубейшыя скажэньні.

Вось, напрыклад, Сіроцінскі раён. Тут горача хваляцца, што 56 калгасаў ужо маюць вытворча-фінансавыя пляны. Але якія? Як яны складзены, як арганізаваны брыгады ў калгасах? Ніхто ў раёне ня ведае. Людзі нават ня чыталі гэтых плянаў.

Што-ж уяўляюць сабою сіроцінскія пляны, праштампаваныя раённым земаддзелам? Прывядзем толькі некаталькі фактаў. Зярнеце на вытворча-фінансавы плян калгасу «Бальшавік». У гэтым пляне вызначаюцца наступныя разьмеры ўраджайнасьці: па ільну — ... 1,5 цэнтнэра з гектара і па бульбе... 60. Ясна, што гэта за плян! Чым, як ня простым злачынствам можна назваць такое плянаваньне!

Мы абавязаны і можам сабраць з кожнага гектара ня менш, як па 2,4 цэнтнэра ільну, 8 цэнтн. збожжавых і 100 цэнтнэраў бульбы. Гэта мінімальныя лічбы, якія павінны быць абавязкова дасягнуты ў кожным калгасе.

А тут, у Сіроцінскім раёне, так зла чынна зьнижаюць нават абавязковы графік ураджайнасьці. Калгас «Бальшавік» — не выключэньне. У тымжа раёне, у калгасе «Чырвоны партызан» устанавілі прыкладна такія-ж лічбы: па ільну — 1,5 цэнтнэра і па бульбе — 75!?..

Або азнаёмцеся з вытворча-фінансавымі плянамі калгасаў Бепрынскай МТС. Амаль у кожным пляне, складзеным работнікамі МТС, разьмеры ўраджайнасьці скарочаны. У калгасе «Ударнік», напрыклад, вызначылі кантрольную лічбу ў... 6 цэнтнэраў збожжавых з аднаго гектара. У радзе калгасаў Шклоўскага раёну, паводле іх вытворчых плянаў, мяркуюць сабраць ільну толькі па 1—1,2 цэнтнэра з га.

Падобныя пляны — справа варожых рук. Недабіты вораг імкнецца падарваць дахо[illegible]асьць калгасаў, даходнасьць калгасьнікаў, затармазіць уздым ураджайнасьці калгасных палёў. Тактыка кулацкага ахвосьця набывае самыя рознастайныя формы. Яго мэта — зацягнуць сяўбу і такім чынам нанесьці адчувальныя ўдары па калгасных ураджаях.

У калгасе «Парыская-камуна» (Віцебскі раён) праўленьне склала плян, у якім тэрміны сяўбы расьцягнуты на... 40 дзён. Аналёгічныя факты зарэгістраваны і ў цэлым радзе іншых раёнаў, напрыклад, Церахаўскім, дзе многія калгасы расьцягнулі тэрміны сяўбы на 30-35 дзён і больш.

Чаму сталі магчымымі такія факты?

Прычына — у яшчэ нізкіх панска-бюракратычных мэтадах кіраўніцтва, у адрыве ад непасрэдных калгасных спраў, у штампоўнічыне і алілюйшчыне, што засланілі ў радзе раёнаў жывую канкрэтную справу.

Прычына — у прытупленьні клясавай пільнасьці, у гнілым лібералізьме тых работнікаў, якія хоць і без канца балбочуць аб рабоце пановаму, але самі на справе працуюць па-старому, працуюць, як шляпы.

Прычына — у тым, што і да сёньняшняга дня многія райкомы, многія райвыканкомы і асабліва зямельныя органы ігнаруюць асноўную бальшавіцкую запаведзь — не баяцца адказнасьці, на справе адказваць за работу, кіраваць не наогул, не з габінэтаў, не аднымі словамі і пастановамі, а глыбока вывучаць кожную дробязь, кожную дэталь, на-ходу папярэджваць і выпраўляць кожную памылку, ведаць і добра ведаць, што робіцца ў кожным калгасе, у кожнай брыгадзе.

Самацёк цяпер можа загубіць усю справу. Нішай будуць цэлыя горы самых прыгожых рэзалюцый, самых прыгожых дэклярацый, але прошцана тым кіраўніком, тым камуністам, калі яны ня ведаюць, што робіцца ў іх раёне, калі яны штампуюць весткі аб колькасьці складзеных плянаў і арганізаваных брыгад, але ня бачаць і не выпраўляюць дапушчаных скажэньняў і памылак у гэтай справе.

Лягчэй за ўсё паслаць тэлеграму ў Менск аб лічбе складзеных плянаў і брыгад. Галоўнае, рашаючае ў тым, каб забясьпечыць бальшавіцкую якасьць гэтых плянаў, каб кожная арганізаваная брыгада была сапраўднай пастаяннай вытворчай брыгадай, а не папяровай.

Што можна сказаць у гэтым сэнсе аб сіроцінскім кіраўніцтве і, у прыватнасьці, аб раённым земаддзеле, які залічвае ў зводку складзеных плянаў нават і такія, дзе ясна відна рука кулацкай агентуры, рука кулацка-шкодніцкіх элемэнтаў.

Што можна сказаць аб гарадоцкіх кіраўнікох, якія ня маюць ніякага ўяўленьня аб зьмесьце і якасьці вытворча-фінансавых плянаў, складзеных у калгасах раёну.

Чаму ў калгасах Жлобінскага, Аршанскага, Полацкага, Шклоўскага, Крупскага і некаторых іншых раёнах так ганебна зацягваюцца складаньне плянаў і арганізацыя брыгад? Ёсьць тут і аграномы, і МТС, няма толькі правільных калгасных плянаў.

Ясна ў чым справа. У стаўцы на самацёк, у славесна-дэклярацыйных мэтадах кіраўніцтва, у падмене канкрэтнай работы штампоўнічыпай і алілюйшчынай.

Гэта асабліва праяўляецца ў практыцы арганізацыі пастаянных вытворчых брыгад. Людзі імкнуцца толькі як мага хутчэй арганізаваць брыгады, адзіпуўшы ў бок якасьць справы. Наркамзем і раённыя арганізацыі яшчэ не наладзілі сапраўднага кіраўніцтва гэтай важнейшай работай.

Якія дапускаюцца памылкі і скажэньні?

Першае — стварэньне грамоздкіх, вялікіх брыгад, прычым галоўным чынам, за лік падросткаў.

Другое — мэханічны падыход да разьмеркаваньня зямельных вучасткаў конскага, пагалоўя і інвэнтару паміж брыгадамі. Кожная брыгада ў пасобных калгасах даюць адноль-кавую колькасьць зямлі, цягавай сілы, плугоў і г. д. Ня ўлічваецца, якія культуры і на якіх землях павінна засеяць даная брыгада, склад яе рабочай сілы і г. д.

Трэцяе — абязьлічка і ігнараванне ў пастаяннай вытворчай брыгадзе.

Чацьвертае — імкненьне захаваць пад шыльдай брыгад брыгады-дворкі. Брыгады арганізуюцца не на аснове вытворчага прынцыпу, а па дварох. Склад брыгад зьмяняецца. Пастаянныя зямельныя вучасткі для брыгад не адводзяцца, не даюцца цьвёрдыя брыгадныя заданьні і г. д.

Пятае — ігнараваньне зьвеньневай арганізацыі працы ў самой брыгадзе.

Ілюструем фактамі.

У паляводчых брыгадах калгасу «Новае жыцьцё» — пераважна жанчыны і падросткі. Дарослыя, вопытныя калгасьнікі ня ў брыгадах, не па палявых работах. На ворыва пасылаюцца падросткі, якія яшчэ ні разу не хадзілі за плугам.

З такімі шкоднейшымі тэндэнцыямі трэба рашуча і прытым неадкладна пакончыць. У паляводчыя брыгады—больш вопытных дарослых калгасьнікаў, якім трэба даручыць самыя адказныя работы.

Склад брыгад павінен быць сапраўды пастаянным. Трэба ў корані перасякаць спробы стварацъ брыгады толькі на час адпэй сяўбы. У Быхаўскім раёне, напрыклад, брыгады арганізуюцца выключна на пэрыяд веснавых палявых работ, прычым склад гэтых брыгад мяняецца амаль кожныя 3-4 дні.

Гэта грубейшае скажэньне! Быхаўскія факты павінны паслужыць сур'ёзным урокам для ўсіх раёнаў БССР. Кожнай брыгадзе — пастаянны склад і пастаянныя зямельныя вучасткі на ўвесь час севазвароту.

У Барысаўскім раёне, у калгасе «Чырвоны гай» у паляводчых брыгадах больш чым па 75-80 калгасьнікаў. Як брыгадзіры змогуць кіраваць такімі прамоздкімі брыгадамі? Падобную практыку трэба неадкладна спыніць. Склад брыгады, як правіла, не павінен перавышаць 30-40 чалавек.

Мала замацаваць за брыгадай цягавую сілу і інвэнтар. Трэба, каб у самой брыгадзе кожны конь, кожны плуг меў пастаяннага гаспадара, каб у самой брыгадзе кожны калгасьнік добра ведаў, за што ён адказвае.

А што выпіла ў брыгадах таго-ж самага калгасу «Новае жыцьцё»? Тут абязьлічана ўсё — і коні, і інвэнтар, і работа. Перад самым выхадам у поле калгасьнікі і брыгадзіры бегаюць па стайні, па дварох і шукаюць... коняй, хамутоў, плугоў.

Або прыклад з калгасам «Серп і молат», Барысаўскага раёну. Палі ў гэтым калгасе ўзораны так, што амаль у кожнай баразьне — агрэх за агрэхам. Чаму? Хто пасаваў зямлю? Брыгадзіры ня ведаюць. Зьвеньневая арганізацыя працы ў брыгадах зусім не наладжана. Ворыва абязьлічана. За аратымі не замацаваны пасобныя загоны. Кожны арэ, дзе прыдзецца.

Справа ня толькі ў тым, каб фармальна арганізаваць брыгаду. У кожнай брыгадзе трэба да канца зьнішчыць абязьлічку, трэба, каб кожны калгасьнік адказваў за пэўную справу, каб кожнае звяно ў брыгадзе мела цьвёрдае заданьне.

У нас, у БССР, ёсьць яшчэ надзвычай дробныя калгасы з 10-15 гаспадарак. Ці магчымна ў такіх умовах стварацъ пастаянныя вытворчыя брыгады? Не. У гэтых калгасах трэба дакладна ўлічыць вопыт і працаздольнасьць кожнага калгасьніка і правільна расставіць усе наяўныя сілы так, каб найбольш адказныя і рашаючыя палявыя работы былі замацаваны за лепшымі вопытнымі калгасьнікамі.

Яшчэ і яшчэ раз падкрэсьліваем—масавая сяўба набліжаецца. Яшчэ і яшчэ раз падкрэсьліваем — посьпех сяўбы вырашаецца ў пастаяннай вытворчай брыгадзе.

Ня трацячы ні адпэй хвіліны, мабілізуем усе сілы на тое, каб неадкладна завяршыць складаньне вытворча-фінансавых плянаў і арганізацыю брыгад, каб выправіць усе памылкі, дапушчаныя ў гэтай справе.

Кожны раённы камітэт КП(б)Б, кожны райвыканком і райземаддзел павінны цьвёрда і раз назаўсёды ўлічыць: іх клясавая баяздольнасьць, іх кіраўніцтва, іх работа правяраецца не па колькасьці зводак, не па тым, наколькі гэтыя зводкі запоўнены.

УМАЦАВАНЬНЕ БРЫГАД — вось на чым будзе правярацца іх работа, бо ў руках пастаянных вытворчых брыгад посьпех нашай першай сяўбы другой сацыялістычнай пяцігодкі, ураджаі нашых калгасных палёў.

Жалезны аппар алілюйшчыне, гэтай небясьпечнай рознавіднасьці правага апартунізму на практыцы!

Кінем усе нашы сілы, сілы нашых партыйных арганізацый, нашага калгаснага актыву, дэлегатаў усесаюзнага і ўсебеларускага зьездаў калгасьнікаў-ударнікаў на ўмацаваньне калгаснай брыгады.

Дабём кулака, выганім з калгасных брыгад лодыраў і прагульшчыкаў, зробім кожную брыгаду сапраўдным магутным рухавіком калгаснай вытворчасьці.

Кожная брыгада павінна сваячасова выйсьці ў поле, добра апрацаваць глебу, засеяць у самы кароткі тэрмін і тым самым забясьпечыць самы высокі ўраджай.

ПЕРШЫЯ ВЫНІКІ ЗВЫШРАНЬНЯЙ СЯЎБЫ ЯРАВЫХ

НАРКАМЗЕМ БССР І ТРАКТАРАЦЭНТРЫ ПАДАГУЛІЛІ ПЕРШЫЯ ВЫНІКІ ЗВЫШРАНЬНЯЙ СЯЎБЫ. ПАВОДЛЕ ДАНЫХ НКЗ БССР НА 7 КРАСАВІКА ПА РЭСПУБЛІЦЫ, КАЛГАСЫ І АДНААСОБНЫ СЭКТАР АХАПІЛІ ЗВЫШРАНЬНЯЙ СЯЎБОЙ НАСТУПНУЮ ПЛОШЧУ:

АЎСА ЗАСЕЯНА 1.615 ГЭКТАРАЎ, ЯЧМЕНЮ—339 ГА, БАБОВЫХ КУЛЬТУР—40, ЯРАВОГА ЖЫТА—303, ІЛЬНУ—259, КАНАПЕЛЬ—1 ГЭКТАР, БУЛЬБЫ—50, КАРМОВНІХ КУЛЬТУР—90 І ПШАНІЦЫ—150 ГЭКТАРАЎ.

ДАНЫЯ ТРАКТАРАЦЭНТРАЎ АБ ЗВЫШРАНЬНЯЙ СЯЎБЕ ПА МТС ДАЮЦЬ НАСТУПНЫ МАЛЮНАК.

ПА ЗБОЖЖАТРАКТАРАЦЭНТРУ:

ЖЫТКАВІЦКАЯ МТС ЗАСЕЯЛА: 15 ГА ПШАНІЦЫ, 200 ГА АЎСА, 20 ГА СЛАНЭЧНІКА. ТУРАЎСКАЯ МТС—100 ГА ЯЧМЕНЮ, 100 ГА АЎСА, ЛЕЛЬЧЫЦКАЯ МТС—20 ГА ПШАНІЦЫ І 160 ГА АЎСА, ДАМАНАВІЦКАЯ МТС—400 ГА АЎСА, 15 ГА ІЛЬНУ, 20 ГА ПШАНІЦЫ.

ПА ІЛЬНАТРАКТАРАЦЭНТРУ:

УСЯГО ПА ІЛЬНАВОДЧЫХ МТС ЗАСЕЯНА 172,5 ГА ІЛЬНУ, 2 ГЭКТАРЫ АЎСА. БОЛЬШ ЗА ЎСІХ ЗАСЕЯЛІ ЗВЫШРАНЬНІМ СПОСАБАМ ЛЁЗЬНЯНСКАЯ, ТАЛАЧЫНСКАЯ І ГОРАЦКАЯ МТС. ЛЁЗЬНЯНСКАЯ МТС ЗАСЕЯЛА 110 ГА ІЛЬНУ, ТАЛАЧЫНСКАЯ 25 І ГОРАЦКАЯ 20.

МАШЫНА-ТРАКТАРНЫЯ СТАНЦЫІ ЦЭНТРАЛЬНАЙ ЗОНЫ БССР ЗАСЕЯЛІ ЗВЫШРАНЬНІМ СПОСАБАМ:

СТАРОБІНСКАЯ МТС—500 ГА АЎСА, 30 ГА ПШАНІЦЫ. КАПЫЛЬСКАЯ—410 ГА АЎСА, 15 ГА ПШАНІЦЫ І 20 ГА ІЛЬНУ. ПУХАВІЦКАЯ—132 ГА ПШАНІЦЫ, 650 ГА АЎСА І 240 ГА ЛУБІНУ. ПЛЕШЧАНІЦКАЯ—250 ГА АЎСА І 40 ГА ІЛЬНУ. БЯГОМЛЬСКАЯ—15 ГА ПШАНІЦЫ. СЛУЦКАЯ—350 ГА АЎСА, 40 ГА ІЛЬНУ І 10 ГА ПШАНІЦЫ.

У РАДЗЕ ПАЎДНЁВЫХ І ЦЭНТРАЛЬНЫХ РАЁНАЎ, ДЗЕ ДАЗВАЛЯЮЦЬ КЛІМАТЫЧНЫЯ ЎМОВЫ, ПАЛЯВЫЯ РАБОТЫ РАЗГОРТВАЮЦЦА.

***

СУРАЖ, 9.

ПААСОБНЫЯ КАЛГАСЫ РАЁНУ ПРЫСТУПАЮЦЬ ДА ЗВЫШРАНЬНЯЙ СЯЎБЫ. РАЗГАРНУЛІСЯ ПАЛЯВЫЯ РАБОТЫ Ў КАЛГАСАХ «КАСТРЫЧНІК», «ПЕРШЫ МАЙ», «УДАРНІК», «НОВЫ БЫТ» І «ГУДОК». ЗАСЕЯНЫ ПЕРШЫЯ 6 ГЭКТАРАЎ ІЛЬНУ.

БРЫГАДЫ ВЫШЛІ Ў ПОЛЕ

Б.-КАШАЛЕЎСКАЯ, 9.

Калгас «Ураджай», Забабскага сельсавету, узорана падрыхтаваўся да сяўбы. Насеньфонды палкам і поўнасьцю ссыпаны і ачышчаны. Арганізавана пільная ахова насеньня. Скончан рамонт усяго інвэнтару і с.-г. машын.

У калгасе створаны 4 паляводчыя брыгады, якімі кіруюць лепшыя калгасьнікі-ўдарнікі, у тым ліку дэлегат першага ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў камсамолец тав. **АВЕРКІН.**

Тав. Аверкін — брыгадзір першай брыгады — пераняў вопыт работы зьезду калгасьнікаў-ударнікаў ня толькі ў сваю брыгаду, але і ва ўвесь калгас.

Усе чатыры брыгады поўнасьцю гатовы да сяўбы. За кожнай брыгадай замацаваны коні, збруя, інвэнтар і насенныя фонды. Для брыгад адведзены пастаянныя зямельныя вучасткі на ўвесь час севазвароту, які ўведзен у калгасе.

Пасеўны плян даведзен да кожнага калгасьніка. Цяпер ня толькі брыгады, але і пасобныя калгасьнікі добра ведаюць дзе, калі і якія культуры яны павінны засеяць.

Паміж брыгадамі заключаны сацыялістычныя дагаворы на лепшае правядзеньне палявых работ. Дагаворы ажыцьцяўляюцца на справе. Калгас адным з першых у раёне выйшаў на палявыя работы.

Ужо ўзорана і засеяна пад рунія яравыя культуры 15 гэктараў. 4 гэкзавіка паляводчыя брыгады пачалі рыхтаваць глебу пад ячмень.

На палявых работах заведзены чорная і чырвоная дошкі і выпускаецца газэта, якая паказвае работу кожнай пасобнай брыгады.

Калгас выклікаў на сацыялістычнае спаборніцтва суседнія калгасы «Шлях да сацыялізму» і «Перамога».

Прыступіў да палявых работ таксама і калгас «Перамога», Ліпініцкага сельсавету. Усе брыгады калгасу выйшлі ў поле на звышраньнюю сяўбу. У першы-ж дзень выхаду ў поле — 30 сакавіка ўзарана 4 га. На другі дзень выйшлі ў поле 2 брыгады, якія ўзаралі 6 га. Першага красавіка калгас «Перамога» ўзараў яшчэ 7 гэктараў.

НА ЗЯМЛІ ВАЛЯЕЦЦА РУЛЬ...

ЖЛОБІН, 7. (Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

Жлобінская МТС абслугоўвае 56 калгасаў у 9 сельсаветах. Гэта значыць, што МТС поўнасьцю адказвае за правядзеньне сяўбы ў палове калгасаў раёну.

Сама станцыя непасрэдна сваімі машынамі павінна правесьці наступныя работы: узараць 1.393 га, задыскаваць 100 га, пасеяць радавымі сеялкамі 836 га і пасадзіць 80 га бульбы.

МТС мае 20 трактараў. І вось, калі палова калгасаў, якія абслугоўваюцца МТС, ужо вышла на палявыя работы, калі машыны павінны ўжо быць непасрэдна на вучастках у полі, аказваецца, што... большасьць трактараў яшчэ не гатова.

Не гатова галоўным чынам таму, што кіраўніцтва МТС (дырэктар Журак, агранам Лагун, сакратар ячэйкі КП(б)Б Шышоў) праявілі апошнюю непаваротлівасьць і бязьдзейнасьць.

Майстэрня МТС, дзе рамантуюцца трактары, знаходзіцца ў вёсцы Саланое. Кантора МТС — у Жлобіне. Адлегласьць — 5-6 кілёметраў. Кіраўніцтва МТС з канторы вылазіць вельмі рэдка, бацца, трэба думаць, каб не пуставалі паседжаныя крэслы. У майстэрні дырэктар Журак бывае наскокам. Самы адказны вучастак падрыхтоўкі да сяўбы быў пакінут на волю лёсу.

Што сапраўды робіцца ў майстэрні?

Пад'язджаем да вёскі Саланое. Вось і гумно, дзе зьмяшчаецца майстэрня. Тут-жа ў розных кутках, аблепленыя гразьлю, асірацела стаяць трактары. Паміж будынкамі на гародзе раскіданы плугі. Імі прабавалі араць і... так і пакінулі, ня выцягнуўшы з глебы, плугі пачалі іржавець.

Пачынаем агляд трактараў. Першым стаіць трактар № 7. У ім не хапае дзьвёх пробак — адпэй ад паветраачысьціцеля і другой ад радыятара. Няма ні адпэй фары (ліхтара).

Далей ідзе трактар № 4. Тут таксама няма бабін і фар. Трактар № 9 зусім разобран. У ім няма радыятара (рамантуецца пасьля «рамонту»), няма і бака для газы. На зямлі... валяецца руль. У трактары № 8 няма пробак, ня відаць і пакрыўкі для бабін. У такім-жа становішчы знаходзяцца і трактары №№ 14, 12, 11 і 16. Карацей кажучы, ні адна машына, што стаіць на дварэ, да выхаду ў поле не гатова.

5 трактараў МТС рамантавала Жлобінскае чыгуначнае дэпо. Пасьля дакладнай праверкі выявілася, што ўсе 5 трактараў да работы непрыгодны і патрабуюць паўторнага рамонту.

І вось, ня гледзячы на тое, што ні адна машына да работы не гатова, дырэктар МТС Журак і яго намесьнік Стоўпнэр парашылі ня сёньня-заўтра накіраваць трактары ў поле бяз фар, бяз ключоў, бяз леяк. Можна загадзя сказаць, што трактары папрацуюць дзень-два і стануць.

Як стаіць справа з гаручым?

Намесьнік дырэктара Стоўпнэр, які адказвае за гэту справу, увесь час запэўняў:

«У нас на станцыі Жлобін газа заўсёды ёсьць, так што гаручага ў нас заўсёды хопіць».

Аднак, сапраўднасьць абвергае аптымізм Стоўпнэра. Каб выканаць усе веснавыя работы МТС, трэба завезьці 65,9 тон газы і 9,9 тон бензыны. Фактычна завезена газы толькі... 12,3 тоны.

Для работы 20 трактараў у дзень патрэбна 2,2 тоны газы. Такім чынам запасаў гаручага хопіць толькі на 5 дзён работы. На шосты дзень трактары прымушаны будуць стаць з-за адсутнасьці газы. Вось цана казённага аптымізму.

Вывад адзін: Жлобінская МТС да сяўбы зусім не падрыхтавана. Наркамзем БССР, Трактарацэнтр і Жлобінскі райком КП(б)Б павінны неадкладна зрабіць адпаведныя і канкрэтныя вывады.

П. Ч.

НАСЕНЬНЕ НА СКЛАДАХ, А АБМЕН НЕ РАЗГОРНУТ

БЫХАЎ, 10. (Па тэлеграфу)

На складах Быхаўскага аддзяленьня Загатзбожжа ляжыць 300 цэнтнэраў пасеўнага аўса. Абменена ўсяго 20 цэнтн.

На складах загатільну ляжыць 4 тоны ільнянога сеяна.

Райземаддзел і райпасеўком ня ўжываюць ніякіх мер, каб паскорыць абмен насеньня.

Нэйдлін.

Брыгада Сякерыча

ЧЫРВОНАЯ СЛАБАДА, 6.

Ураджай калгасу, даход саміх калгасьнікаў у першую чаргу залежаць ад работы пастаяннай вытворчай брыгады. Там, дзе брыгада існуе не на паперы, а апраўды зьяўляецца асноўным зьвяном калгаснай вытворчасьці—там калгас падрыхтован да сяўбы. Гэта яркa паказвае хоць-бы практыка перадавых калгасаў Чырвона-Слабодзкага раёну.

Для прыкладу возьмем калгас «Прамень». Тут брыгада ўжо стала асноўнай вытворчай адзінкай. Усе падрыхтоўчыя работы да веснавой сяўбы праводзіць брыгада. Вось як працуе брыгада № 3, на чале з брыгадзірам тав. Сякерычам.

Яго брыгада складаецца з 15 мужчын і 25 жанчын. Яшчэ з восені брыгада атрымала 20 коняй, збрую і ўвесь патрэбны інвэнтар. Усё гэта ўнутры брыгады не абязьлічана. Кожны калгасьнік ведае, дзе стаіць замацаваны за ім конь, дзе знаходзіцца збруя і калёсы. За ўсё гэта ён нясе адказнасьць. Брыгадзе ўжо даўно вызначан вучастак у арэвым кліне.

У брыгадзе Сякерыча вясна пачалася з восені. Каб дабіцца высокага ўраджаю, брыгада ўжо ў зімовы час вывезла на свой вучастак 299 тон гною і набыла 3 цэнтнэры мінэральных угнаеньняў. За высокі ўраджай тут змагаюцца канкрэтнымі справамі.

Брыгадзір Сякерыч на вопыце мінулага году пераканаўся, што засеяць у кароткія тэрміны можна толькі тады, калі ў брыгадзе моцныя коні, калі іх добра дагледаюць і як належыць кормяць, асабліва ў часе палявых работ. І сапраўды, у брыгадзе Сякерыча коні ўсе здавальняючай сытасьці. Яшчэ з восені Сякерыч забраніяваў на час палявых работ 255 пудоў лепшага мурожнага сена і 90 пудоў аўса. Кормы брыгадзір хавае ў добрых сьвірнах. Ключы ад сьвірнаў ён нікому не давярае, а заўсёды трымае ў сябе.

Без актыву брыгады Сякерыч сам не праводзіць ні аднаго мерапрыемства. У дробязі калгаснай вытворчасьці ён уцягвае ўсю брыгаду, кожны калгасьнік загадзя ведае, ШТО заўтра будзе рабіць яго брыгада.

Вось і зараз перад выхадам у поле Сякерыч скліканў сваю брыгаду, каб дэталёва абмеркаваць гадавое вытворчае заданьне і рабочы плян палявых работ. У брыгадзе Сякерыча кожны ведае, якую культуру і калі яны будуць сеяць. У першую чаргу брыгада парашыла засеяць любін на насеньне, кармавую віку, авёс, лён, ячмень, бульбу і гароднія культуры.

Брыгада абмеркавала і нормы выпрацоўкі. У гэтым годзе яны значна вышэйшыя чым у мінулым. Так, па возьрыве брыгада вызначыла норму ў 0,7 га, па баранаваньні—5 га, развозка і разьбіўка гною—25 вазоў.

На аснове рабочага пляну і зацьверджаных норм брыгада парашыла правесьці сяўбу за 14 дзён. Гэта ўжо цьверда ведае кожны калгасьнік з брыгады Сякерыча. Рэальнасьць вытворчага заданьня брыгады № 3 пацьвярджаецца самім вопытам работы. Напрыклад, на вывазку 299 тон гною брыгада затраціла 73 працадні, як і было вызначана плянам.

Або калгас «Бальшавік». Тут брыгада таксама зьяўляецца асноўным зьвяном вытворчасьці. Для прыкладу спынімся на брыгадзе № 1, брыгадзір тав. Мэкуценя. Яго брыгада складаецца з 16 мужчын і 24 жанчын. Коняй у брыгадзе 18, усе яны сярэдняй сытасьці. Вупраж і збруя падагнана да кожнага каня. Сельска-гаспадарчы інвэнтар і коні замацаваны за кожным калгасьнікам.

Зараз, напярэдадні выхаду ў поле, брыгада самым дэтапёрым чынам абмеркавала вытворчае заданьне. Брыгадзе адведзен вучастак у 60 га, на якім яна засее 14,75 га аўса, 8,25 га ячменю, 2 гэктары гароху, грэчкі—2,3 га, ільну—2,9 га, бульбы—29 га і гароднінy.

Брыгада абмеркавала і зацьвердзіла дэталёвы рабочы плян палявых работ, на аснове якога яна і вызначыла пра весьці сяўбу за 15 дзён.

На свой вучастак брыгада Мануцені вывезла 430 вазоў гною. Кожны калгасьнік вывез на палі брыгады гной з уласных хлявоў, пакінуўшы на свае гароды толькі па 2 вазы.

У калгасе «Бальшавік» усе брыгады добра ведаюць свае вучасткі. Там, дзе брыгада ў мінулым годзе сеяла азімае жыта, там яна і будзе праводзіць уборку.

Аднак, ня ўсюды ў раёне такое становішча, як у калгасах «Прамень» і «Бальшавік», ня ўсюды зразумелі значэньне пастаяннай вытворчай брыгады. За прыкладам далёка хадзіць ня трэба. Узяць хаця-б Смаліцкі сельсавет, таго-ж Чырвона-Слабодзкага раёну. Старшыня сельсавету Кляпко і сакратар партячэйкі Закрэўскі пытаньнямі арганізацыі працы ў калгасах і правільнай расстаноўкі рабочай сілы зусім ня цікавяцца. Ніякіх канкрэтных практычных указаньняў калгасам яны не даюць. Горш таго, прыспаныя 20 сакавіка прыкладныя нормы выпрацоўкі да апошніх дзён марыкавіраліся ў сельсавеце. Старшыня сельсавету, атрымаўшы нормы паклаў іх у шафу, там яны і ляжалі, закінутыя розным хламам.

Што-ж атрымалася ў выніку такой безадказнасьці і бязьдзейнасьці кіраўнікоў сельсавету?

У калгасе «Чырвоны пагранічнік», Смаліцкага сельсавету, ніадаўна склалі вытворча-фінансавы плян, але такі заблытаны, што брыгадзіры цэлы тыдзень мяркавалі як расстаўіць рабочую сілу на аснове гэтага пляну і, натуральна, нічога ня вырашылі. У пляне няма ні аднэй правільнай лічбы. Усё пераблытана—у графы веснавых работ пастаўлены ўборачныя работы і наадварот.

Аўтары гэтага пляну зьяўляецца ніхто іншы, як агранам Танежыцкай МТС Грань. Аб тым, як ён адносіцца да такой складанай справы, як вытворча-фінансавы плян калгасу, гавораць самі мэтады яго работы. Грань прыехаў у калгас раніцой. Ён ні з кім на раёсе—ні з брыгадзірамі, ні з калгасным актывам, ні з старымі вопытнымі калгасьнікамі. Грань проста сеў у калгасны канцылярыі і механічна за дзень расьпісаў на паперы вытворчы плян двух брыгад, ня ўлічыўшы ні магчымасьці калгасу, ні яго гаспадарчую моц.

Калгас «Чырвоны пагранічнік» у сацыялістычным дагаворы з калгасам «КІМ» узяў на сябе абавязак дабіцца 11 цэнтнэраў аўса з гэктара. Калгасьні кі лічаць, што ў іх ёсьць усе ўмовы для таго, каб атрымаць такі ўраджай, агранам Грань мэханічна расьпісаў па графах ураджайнасьці па 9 цэнтнэраў збожжавых з гэктару, і кропка. Што яму да асаблівасьцяй данага калгасу—абы з рук збыць.

Зараз, калі трэба выяжджаць у поле брыгадзіры і калгасьнікі ня ведаюць сваіх вучасткаў. Гэта вынік шкодніцкай работы агранома Граня.

На прыкладзе гэтых трох калгасаў са ўсёй яскравасьцю выяўляецца якое значэньне для пасьпяховай падрыхтоўкі да выхаду ў поле і правядзеньня сяўбы мае дасканала складзены вытворчы плян і стапая, сапраўды моцная калгасная брыгада!

З—Н.

ГОРАЦКАЯ НЭЙТРАЛЬНАСЬЦЬ...

ГОРКІ, 10. (Наш кар.).

На 5 красавіка паводле зводкі райземаддзелу калгасы раёну ссыпалі ў насенныя фонды: збожжавых 98 проц., ільну 77 проц., канапель 87 проц. і бульбы 87 проц. Ёсьць сельсаветы, дзе насеньне ссыпана толькі на 50-70 проц.

Што-ж зроблена раённымі арганізацыямі для таго, каб скарыстаць унутрыраённыя рэсурсы, каб арганізаваць міжкалгасны абмен насеньнем і ўнутрыкалгасную сацыялістычную пазыку? На гэта пытаньне можна адказаць коратка і вычарпальна:

— Нічога.

Загадчык райземаддзелу Кавалёў і сакратар раённага камітэту партыі Чорнабародаў лічаць, што ніякай плянавасьці ў справу абмену насеньня між калгасамі ўводзіць... ня трэба.

— Калгасы лепш за нас ведаюць, дзе і што можна абмяняць, — вось адказ сакратара райкому і загадчыка райземаддзелу.

Карацей кажучы, ра

АБ РАБОЦЕ ВУГОЛЬНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ ДАНБАСУ

Пастанова СНК Саюзу ССР і ЦК УсеКП(б)

Саўнарком Саюзу і ЦК УсеКП(б) устанаўляюць, што, ня гледзячы на бязупынны рост тэхнічнай узброенасьці Данбасу і палепшэньне рабочага спатаканьня, плян здабычы ня толькі ня выкананецца і здабыча вугалю ня толькі не ўзрасла, а, наадварот, зьнізілася за першы квартал 1933 году да 10.371 тыс. тон супроць 10.912 тыс. тон за першы квартал мінулага году.

СНК Саюзу ССР і ЦК УсеКП(б) лічаць, што галоўнай прычынай гэтага ганебнага руху назад зьяўляецца ўсё яшчэ ня зжыты, канчаткова збанкрутаваўшы вашыльнярска - бюракратычны мэтад кіраўніцтва вугольнай прамысловасьцю, пачынаючы ад калёны і канчаючы «Главтопом» Наркамцяжпраму.

Пакуль здабыча вугалю ішла, галоўным чынам, ручным спосабам і асвоілі, дарма ўстановленыя простыя тэхнічныя ў рабоце, можна было яшчэ цярпець вашыльнярска - бюракратычны мэтад кіраўніцтва, бо ён на ўсе яшчэ даць такіх адчувальных адмоўных рэзультатаў у рабоце. Можна было цярпець такія агідненькія факты, як скашцентраваньне лепшых тэхнічных і арганізатарскіх сіл у трэстах, а не на капальні. Можна было цярпець такія агідненькія факты, як большыя небясьпечнасьць зарплатай і іншыя вынікамі цякучасьці ў трэсьце і меншая забясьпечанасьць рабочых і служачых на капальнях. Але цяпер, калі асноўная частка здабычы робіцца пры дапамозе машын, калі мэханізаваная здабыча вугалю лёс вугольнага Данбасу, калі адзначаныя вышэй адмоўныя факты ва ўмовах ліквідацыі беспрацоўя набываюць трывожна-вострый характэр, цярпець такіх гэтыя агідненькі няма ніякай магчымасьці.

Трэба ўлічыць, што ўмовы на капальнях зьмяніліся ў корані. Зьмяніўся склад рабочых на капальні — ён стаў больш кваліфікаваным. Зьмянілася праца на капальнях — яна стала больш складанай. Зьмяніліся патрабаваньні капальні — капальня адчуває патрэбу ў новых інжынерах і тэхніках у значна больш вялікай колькасьці, чым гэта мела месца пры ручной здабычы. Цяпер лепшыя інжынерна-тэхнічныя сілы, лепшыя арганізатары павінны быць скашцентраваны на капальні, а ня ў трэсьце. Але скашцентраваць іх на капальні адным толькі адміністрацыйным распарадкаваньнем нельга. Для гэтага трэба вымяніць у корані арганізацыю зарплаты: яе трэба арганізаваць так, каб найбольш высокую зарплату атрымлівалі ня трэстаўскія вашыльнярысты, а работнікі на капальні. Калі раней можна было кіраваць з трэсту цілкам простай дачы дырэктыў, то цяпер гэтага зусім мала. Цяпер галоўнае ў кіраўніцтве з боку трэсту заключаецца ў фактычнай штодзённай праверцы выкананьня дырэктыў на канкрэтнай рабоце ў капальнях.

Асноўныя недахопы ў рабоце вугольных трэстаў Данбасу і «Главтопа» Наркамцяжпраму, таксама як і парт-арганізацыі Данбасу, заключаецца ў тым, што яны не зразумелі гэтай карэнной зьмены ва ўмовах здабычы вугалю «ры мэханізацыі і па-ранейшаму разглядаюць капальню, як месца работы простых зямлекопаў, тады як капальня ператварылася ўжо ў вытворчы завод са складанымі мэханізмамі, які вымагае сур'ёзнай працы і сур'ёзнага адбору людзей для асваеньня новай тэхнікі, які вымагае кваліфікаваных пастаянных (не цякучых) кадраў больш кваліфікаваных рабочых, больш вопытных арганізатараў, больш інжынэрных інжынераў і спэцыялістаў, які вымагае лепшага забясьпечаньня падземных рабочых параўнальна з надземнымі.

Асноўныя недахопы ў рабоце вугольных трэстаў Данбасу, «Главтопа» Наркамцяжпраму і Данецкага абкому заключаецца ў тым, што яны не зразумелі ўсяго гэтага і не пакласьці ліся аб тым, каб па-новаму арганізаваць зарплату і аператыўна перабудаваць расы работнікаў вугольнага Данбасу з упорам на капальню.

Гэты недахоп маюць асабліва тыя з кіруючых работнікаў трэстаў і рудакіраўніцтваў, якія працуюць балбатнёй аб «нерэальнасьці» пляну і прыкрыць сваю бездапамочнасьць і бюракратызм. Гэта ў асаблівасьці адносіцца да кіраўніка трэсту «Сталінуголь» т. Абакумава, які зьяўляецца найбольш яркім выразьніцелем старых канцылярска - бюракратычных і эмпырыкэмпірыстарскіх настроеў.

Найбольш яркім паказальнікам бязрукасьці і бясцырыкладнай адсталасьці гаспадарчага і партыйнага кіраўніцтва вугольнага Данбасу трэба лічыць пануючую на капальнях так званую цякучасьць рабочых і служачых. Паводле даных вучотных арганізацый, за 1932 год кінула капальні 423 тысячы рабочых і служачых і прынята на работу за той-жа перыяд 408 тысяч рабочых і служачых, а за студзень 1933 году кінула 32 тысячы і прынята на работу 35 тысяч рабочых і служачых. Гэта значыць, што значная частка рабочых і служачых, калі ня большасьць, ня столькі працуе, колькі бадзяецца «бяз стомы» ад капальні да капальні, з капальні ў вёску, з вёскі ў капальню, узвальваючы ўвесь цяжар работы па здабычы вугалю на найбольш сумленных і пастаянных рабочых і служачых вугольнага Данбасу. Зразумела, што пры такой «цякучасьці» немыслімы ажыцьцяўленьне колькі-небудзь здавальняючае **асваеньне новай тэхнікі**, новых мэханізмаў. А асваеньне новай тэхнікі зьяўляецца, як вядома, ключом для ўздыму гаспадаркі ўсяго вугольнага Данбасу.

Ня менш яркім паказальнікам бязрукасьці і бясцырыкладнай адсталасьці гаспадарчага і партыйнага кіраўніцтва вугольнага Данбасу трэба лічыць цяперашняе арганізацыйнае пабудаваньне органаў кіраўніцтва капальняй. Праверка паказала, што замест **скашцэнтраваньня** справы кіраўніцтва капальняй (здабыча і вывазка вугалю) у руках загадчыка і яго намесьніка (галоўнага інжынера) кіраўніцтва капальняй **расканцэнтравана і разьбіта** на рад шматлікіх выдзеленых функцый з мноствам зусім непатрэбных аддзелаў і сэктараў, у сувязі з чым зьнікае як магчымасьць сапраўднага кіраўніцтва капальняй, так і адказнасьць за гэта кіраўніцтва. Атрымліваецца не кіраўніцтва капальняй, а абязьлічка кіраўніцтва і абязьлічка адказнасьці. На многіх колькі-небудзь буйных капальнях, у адным толькі кіраўніцтве (на паверхні), ёсьць, напрыклад, наступныя сэктары і пасады: 1) загадчык капальняй, 2) галоўны інжынэр, 3) загадчык горнымі работамі, 4) загадчык капітальнымі работамі, 5) загадчык рацыяналізацыяй, 6) загадчык тэхнарматаваньнем, 7) загадчык сэктарам праектаваньня вытворчых працэсаў, 8) загадчык тарыфна-эканамічным сэктарам, 9) загадчык плянавым аддзелам, 10) загадчык тэхнікай бясьпечнасьці, 11) загадчык мэханізацыяй, 12) загадчык маркшэйдэрскім бюро, 13) загадчык узбагачэньнем, 14) загадчык тэлефонам, 15) загадчык вентыляцыяй, 16) загадчык рухам, 17) загадчык фінансавым аддзелам, 18) галоўны бухгальтар, 19) загадчык жыльлёва-камунальным аддзелам, 20) загадчык конным двором, 21) загадчык гаспагарай, 22) загадчык кладовай. Калі дадаць да гэтай арганізацыйнай «функцыянальнай» блытаніны той факт, што ўсе гэтыя загадчыкі працуюць не ў капальні, а на паверхні, што многія з іх маюць свае ўнутраннавожаных у капальні, якія ня столькі дапамагаюць загадчыку вучасткам, колькі перашкаджаюць яму і тармозяць яго работу, то можна лічыць малюнак арганізацыйнага пабудаваньня кіраўніцтва капальняй, або правільней — малюнак яго арганізацыйнага няўстройства, — больш ці менш поўным. Зразумела, што пры такой арганізацыйнай блытаніне капальняй нельга кіраваць колькі-небудзь здавальняюча.

Ня можа быць сумненьня, што ўказаныя агідненькі з «цякучасьцю» і арганізацыйнай блытаніной у кіраўніцтве капальняй ня мелі-б месца, калі-б кіраўніка капаленъ, за нямногімі выключэньнямі, зьяўляліся сапраўднымі кіраўнікамі, а ня пустымі рэгістратарамі «шадрэй, якія здабываюцца на капальні», калі-б кіраўніцтва капальняй было перабудавана не па функцыянальнаму, а па вытворчаму прынцыпу са скашцэнтраваньнем кіраўніцтва ў руках загадчыка капальняй і загадчыкаў вучасткамі, калі-б апарат кіраўніцтва капальняй працаваў з упорам на аператыўнае кіраўніцтва падземнымі работамі, а не на канцылярскую пэпіню, калі-б кіраўнікі капаленъ і рудакіраўніцтваў правяралі ў жыцьцё закон супроць прагульшчыкаў і лятуноў аб пазбаўленьні харчовых картак і права на жыльлоплошчу прагульшчыкаў, лятуноў, рвачоў і ўсякага роду «бадзяжных людзей», а не засьмечвалі вочы нікому непатрэбнымі прамовамі і розапцыямі, калі-б трасты і Донбаском займаліся, як належыць, арганізацыяй перасоўваньня сіл і сродкаў і палепшэньнем сыстэмы зарплаты з упорам на капальню, а не канцылярскімі практыкаваньнямі закон трэстаў і бясконцай кампаніяй агульнай «масавай вярбоўкі» рабочых, якая ўзмацнее, а не аслабляе «цякучасьць», калі-б кіраўнікі трэстаў, рудакіраўніцтваў і капаленъ сталі самі на чале работы па **разьмеркаваньні кадраў** і сыстэматычнай **праверкі выкананьня**, а ня ўзвальвалі гэтыя рашаючыя справы на другарадных работнікаў.

СНК Саюзу ССР і ЦК УсеКП(б) пастанаўляюць:

1. Для палепшэньня гаспадарчага кіраўніцтва трэстамі па здабычы вугалю разбуйніць «Главтоп» Наркамцяжпраму СССР, арганізаваўшы замест яго Галоўнае кіраўніцтва па вугалі і сланцох («Главуголь») і Галоўнае кіраўніцтва па нафце («Главнефть»), а сэктар апалярызмеркаваньня і «Союзторф» падпарадкаваць непасрэдна НКЦП.

2. Перабудаваць сыстэму кіраўніцтва на капальні такім чынам, каб: а) скашцэнтраваць непасрэднае кіраўніцтва здабычай і вывазкай вугалю ў руках загадчыка капальняй і яго намесьніка — галоўнага інжынэра, усклаўшы на іх усю адказнасьць за работу капальні; б) скараціць агульную колькасьць служачых у кіраўніцтве капальняй і скасаваць рад непатрэбных функцыянальных аддзелаў і пасад, у першую чаргу плянавы аддзел, бюро рацыяналізацыі, пасаду загадчыка мэханізацыяй, пасаду загадчыка тэлефонам, пасаду загадчыка капітальнымі работамі (пры адсутнасьці капітальных работ) з тым, каб інжынэру і тэхніку, якія аслабяваюцца, перанесьці на работу ў капальні; в) кіраўніцтва ў капальні пабудаваць па тэрытарыяльна-вытворчаму прынцыпу, перадаўшы загадчыку вучасткам усе вытворчыя функцыі на яго вучастку і ўсклаўшы на яго ўсю адказнасьць за работу вучастку; г) адпаведна перабудаваць работу рудакіраўніцтваў і трэстаў, скараціўшы іх апарат, скашцэнтраваўшы іх цалкам на непасрэдным аператыўным кіраўніцтве капальнямі і штодзённым выпраўленьні выяўленых недахопаў у рабоце па здабычы вугалю; д) рад буйных капаленъ, прыкладна, тры-чатыры капальні па кожны трэст, перадаць з падпарадкаваньня рудакіраўніцтваў, непасрэдна падпарадкаваўшы іх трэстам.

Даручыць Наркамцяжпраму («Главуголь») распрацаваць у дэкадны тэрмін канкрэтны плян ліквідацыі арганізацыйнага няўстройства на капальнях на аснове гэтых арганізацыйных указаньняў.

3. Лічыць важнейшай базавой задачай «Главуголя», трэстаў, капаленъ, партыйных і прафсаюзных арганізацый Данбасу—ліквідацыю нячуванай цякучасьці рабочых кадраў Данбасу, для чаго: а) пастаўіць арганізаваны прыём і звальненьне рабочых з пазначэньнем па гэту справу буйных работнікаў; б) ліквідаваць агульны абязьлічаны падыход гаспадарчых і прафсаюзна-партыйных работнікаў да рабочых, якія прымаюцца і ўходзяць, і правесьці арганізаваную масава-палітычную работу сярод рабочых аб прыняцьці імі на сябе самаабавязацельства па рабоце ў данай капальні на працягу двух-трох год, забясьпечыўшы іх кватэрамі і дапамогай у набыцьці жатнай гаспадаркі, індывідуальных гародаў і інш.; в) ліквідаваць недапушчальную пасьпешнасьць у справе правядзеньня дэкрэту аб барацьбе з прагульмі і паўсюдну барацьбу не на словах, а на справе з лятунамі, якія разбураюць вытворчасьць, мабілізуючы ўсе вагары дэйна-палітычнага і гаспадарчага ўзьдзеяньня (трамадзкі байкот, непрыняцьце на работу ў іншых капальнях і г. д.).

4. Ліквідаваць уравнілаўку ў сыстэме зарплаты, для чаго: а) забясьпечыць больш высокую зарплату для падземных рабочых параўнальна з надземнымі; б) прыняць існуючую прагрэсыўку непыстарчальнай і накіраваць увесь адпушчаны фонд прыбылькі зарплаты на пакліканьне прапрэсыўнай аплаты з тым, каб за кожную дадатковую выпрацоўку звыш нормы, работы атрымліваў усё больш прапарцыянальную надбаўку; в) павялічыць прэміраваньне за эканомію матэрыялаў і бясьперабойнасьць іх работы; г) павялічыць фонд зарплаты інжынэрна-тэхнічнага персаналу вугольнага Данбасу ня 10 проц. з тым, каб работнікі ў апараце кіраўніцтва капальняй атрымлівалі, як правіла, больш, чым адпаведныя работнікі ў трэсьце і рудакіраўніцтве, а работнікі на падземных работах атрымлівалі больш, чым адпаведныя работнікі на паверхні.

Даручыць Наркамцяжпраму («Главуголь»), ЦК Саюзу вугольных рабочых і Донбаскому ў дэкадны тэрмін разпрацаваць на аснове гэтых указаньняў канкрэтныя мерапрыемствы ў галіне зарплаты рабочых і інжынэрна-тэхнічнага персаналу.

5. «Главуголю» скашцэнтраваць на капальнях лепшых гаспадарнікаў і інжынэрна-тэхнічных работнікаў, праведзёўшы неабходную перакладку з апаратаў трэстаў, рудакіраўніцтваў і іншых устаноў, а ўнутры капаленъ — з надземных работ на падземныя.

Донбаскому і сакратару па вугалі таў. Церахаву забясьпечыць падбор лепшых партыйных і прафсаюзных арганізатараў для капаленъ за кошт раённых партыйных арганізацый і абласных органаў.

Умацаваньне кадраў работнікаў капаленъ праводзіць не ў парадку агульных мабілізацый і апульных абязьлічаных перакідак, а шляхам персанальнага адбору работнікаў, у першую чаргу, для буйнейшых 72 капаленъ, якія даюць каля паловы ўсёй здабычы вугалю.

Увесьці сыстэму парпарганізатараў на капальнях, а Арбюро ЦК у дэкадны тэрмін распрацаваць палажэньне аб парпарганізатарах.

6. З прычыны асаблівага значэньня справы разьмеркаваньня кадраў і праверкі выкананьня, забраць гэту справу з веданьня другарадных работнікаў і падпарадкаваць яе непасрэдна загадчыкам капальняй, кіраўнікам рудакіраўніцтваў і дырэктарам трэстаў, усклаўшы на іх усю адказнасьць за работу па кадрах і праверцы выкананьня.

***

СНК Саюзу ССР і ЦК УсеКП(б) упэўнены, што партыйныя, камсамольскія, гаспадарчыя і прафсаюзныя арганізацыі Данбасу здолеюць па-баявому арганізаваць барацьбу за выкананьне гэтай пастановы, ўцягнуць сярод рабочых новую хвалю сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва і дабіцца поўнага выкананьня пляну здабычы вугалю.

Старшыня СНК СССР
В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).
Сакратар ЦК УсеКП(б)
І. СТАЛІН.

ПАКОНЧЫЦЬ З БЕЗАДКАЗНЫМІ АДНОСІНАМІ ДА КАНТРАКТАЦЫІ ІЛЬНУ І КАНАПЕЛЬ

ЗАСТАЛОСЯ 15 ДЗЁН

Становішча з кантрактацыяй ільну і канапель па БССР зусім недапушчальнае.

На 5 красавіка работа разгарнулася толькі ў 19 раёнах БССР, прычым у тут малюнак вельмі спракаты. Калі Сураскі раён, напрыклад, ужо выканаў плян на 61 проц., Дрысенскі на 46,4 проц., Шклоўскі на 34,3 проц., дык Касьцюковіцкі раён рэалізаваў заданьне толькі на 0,5 проц., Бешанковіцкі на 0,1 проц., Хойніцкі на 1,9 проц., Асьвейскі на 3,3 проц. і г. д.

Гэта спракатасьць сьведчыць аб не адпаўказай якасьці работы раёнаў. Посьпех дасягнуў там, дзе раённыя арганізацыі адносяцца да кантрактацыйнай кампаніі з усёй большавіцкай сур'ёзнасьцю, разгарнулі работу сапраўды па-баявому, сыстэматычна і аператыўна кіруюць кампаніяй.

На жаль, такія раёны пакуль толькі адзінкі, большасьць-жа дагэтуль яшчэ не разгарнула кантрактацыі. У гэтым ліку знаходзіцца палат і рад ільнавочых раёнаў, як Бяльніцкі, Гарадоцкі, Вушацкі, Крупскі, Расонскі, Сіроцінскі, Талачынскі, Чавускі.

Зусім ясна, што мы маем тут справу з недаацэнкай вялікарнай гаспадарча-палітычнай важнасьці кантрактацыі ільну і канапель, з неразуменьнем значэньня гэтай кампаніі для будучых загатовак. Матар'ялы, якія мы друкуем сёньня з Бешанковіцкага і Ўваровіцкага раёнаў, ілюструюць абы якавасьць, незацікаўленасьць, бястурботнасьць некаторых раённых арганізацый у адносінах да кантрактацыйнай кампаніі.

Недапушчальна зацягнулася давядзеньне пляну да сельсаветаў. У паасобных раёнах з гэтай работай яшчэ ня справіліся і да апошняга часу. У Гарадоцкім раёне плян кантрактацыі даручылі скласьці... сыну кулака, які пастараўся заблытаць даныя з тым, каб зрабіць гэты плян нерэальным.

Клясавы вораг прыкладае ўсе сілы, каб сарваць кантрактацыю.

Да 25 красавіка кантрольныя лічбы па кантрактацыі павінны быць выкананы поўнасьцю. Мы зможам гэтага рабіць толькі пры той умове, калі ўсе раёны, па прыкладу перадавікоў — Сураскага, Дрысенскага і інш., неадкладна па-баявому разгорнуць кантрактацыйную кампанію, калі вакол апошняй будуць мабілізаваны партыйныя і савецкія арганізацыі, увесь загатоўчы апарат, шырокія масы калгаснікаў і працоўных адноасобнікаў.

Сыстэма Белкаапсаюзу да гэтага часу фактычна ня ўключылася яшчэ ў кантрактацыйную кампанію. З 34 раёнаў, замацаваных за спажыўкааператыяй, ні ў адным кантрактацыя не распачалася. Баявая задача Белкаапсаюзу і яго сыстэмы — навярстаць упушчаны час, ліквідаваць прарыў, які стварыўся і дабіцца своячасовага ажыцьцяўленьня кантрольных лічбаў па кантрактацыі па ўсіх 34 раёнах.

Не даволі аператыўна, не даволі выразна кіруе кантрактацыяй і Белкаапсора Загатільну. Аб гэтым сьведчыць хаця-б факт недасылкі блянкаў дагаворў Бешанковіцкаму раёну, аб якім мы сёньня паведамляем. Белкаапсора Загатільну, як асноўная ільнаазагатоўчая арганізацыя БССР, абавязана максымальна ўзмацніць кіраўніцтва кантрактацыйнай кампаніяй, больш эканомна з нізоўкай, больш аператыўна і канкрэтна працаваць.

ПОЎНАЯ БЯСТУРБОТНАСЬЦЬ

Бешанковіцкі раён застаўся ў вялікай запазычанасьці перад дзяржавай па ільнаазагатоўках. Гадавы плян выкананы толькі на 80 проц. Здаваецца-б, раённыя арганізацыі павінны былі ўлічыць урокі ільнаазагатоўчай кампаніі, не дапусьціць паўтарэньня прарыву ў будучых загатоўках. Для гэтага трэба ў першую чаргу па-бальшавіцку правесьці кантрактацыю ільну і канапель.

Аднак, ужо зараз можна сказаць, што раённыя арганізацыі яўна правальваюць гэту важнейшую кампанію. Замест таго, каб разгарнуць кантрактацыю неадкладна пасьля пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР, гэта работа адкладвалася са дня на дзень. Не сьпешаліся нават з давядзеньнем пляну. Фактычна кантрактацыя не разгарнулася і да гэтага часу. На 5 красавіка плян выкананы на... 0,1 проц.

Загадчык райаддзяленьня Загатільну **Ляўковіч** не праяўляе ніякай ініцыятывы, зусім не клапоціцца аб выкананьні ніякіх кантрактацый. Кіруючыя раённыя арганізацыі таксама не аддаюць увагі гэтай рабоце, ня кіруюць кантрактацыйнай кампаніяй.

Раённая газэта «Сталінец» толькі 24 сакавіка надрукавала пастанову СНК і ЦК аб кантрактацыі. Да гэтага часу газэта не зьмясьціла ні адной канкрэтнай заметкі аб ходзе кампаніі. Газэта не змагаецца за баявое разгорваньне кантрактацыі, за ажыцьцяўленьне пастановы партыі і ўраду.

Трэба адзначыць зусім невыстарчальнае кіраўніцтва раёнам з боку Белканторы Загатільну. Даволі сказаць, што апошняя не паклапацілася нават аб своячасовай дасылцы блянкаў для заключэньня кантрактацыйных дагаворў. У Бешанковічах гэтых блянкаў ня было аж да пачатку красавіка.

С. П.

Празявалі сакавік, сьпяць і ў красавіку

Ва Ўварэвічах усю другую палову сакавіка праспалі і толькі 2 красавіка плян кантрактацыі ільну быў давядзен да сельсавету. Раённыя арганізацыі глядзяць на гэту справу, як на другарадную, і лічаць, што кантрактацыя датычыць выключна райаддзяленьня Загатільну.

У раёне было дапушчана грубае скажэньне пастановы СНК БССР і ЦК КП(б)Б аб кантрактацыі, у агульны кантрактацыйны плян былі ўключаны і цьвёрдыя заданьні кулацка-заможным элементам. Ня гледзячы на пратэст прадстаўніка Белканторы Загатільну, раённыя арганізацыі доўга не хацелі выпраўіць гэтай памылкі. Асабліва яе адстойваў загатчык райаддзяленьня Загатільну **Марголін**.

Наогул кампанія на Ўварэвічах яшчэ фактычна не разгарнулася. На 5 красавіка не заключана ні адзін кантрактацыйны дагавор. Раённыя арганізацыі відавочна забываюць, што кантрактацыя — перша і важнейшы этап будучых загатовак, і што яны нясуць поўную адказнасьць за пасьпяховае правядзеньне гэтай кампаніі.

Л—н.

АБ СУЧАСНЫМ СТАНОВІШЧЫ У ГЕРМАНІІ

Рэзалюцыя прэзыдыуму ВККІ па дакладу т. Гекэрта)*

Прэзыдыум ВККІ, заслухаўшы даклад тав. Гекэрта аб становішчы ў Германіі, канстатуе, што палітычная лінія і арганізацыйная палітыка, якая праводзілася ЦК камуністычнай партыі Германіі на чале з тав. Тэльманам да і ў момант гітлераўскага перавороту, была зусім правільнай.

***

Ва ўмовах надзвычайнага абвастрэньня эканамічнага і палітычнага становішча ў Германіі, калі, з аднаго боку, камуністычная партыя ўжо стала вялікай сілай у рабочай клясе і шпарка набывае рэвалюцыйны крызіс, калі з другога боку, выявіліся глыбокія супярэчнасьці ў саміх пануючых клясах і фашысцкая дыктатура у форме ўраду Папэна і Шлейхэра аказалася ня ў стане прыпыніць рост камунізму і знайсьці які-небудзь выхад з эканамічнага крызісу, які ўсё абвастрэцца, германская буржуазія перадала ажыцьцяўленьне адкрытай фашысцкай дыктатуры фашысту Гітлеру і яго «нацыянал-сацыялісцкай» партыі.

Перамога Гітлера і ўстанаўленьне ўлады «нацыянал-сацыялістаў» аказалася магчымымі ў сувязі з наступнымі акалічнасьцямі.

Германская сацыял-дэмакратыя, за якой ішла большасьць пралетарыяту ў пістападаўскай рэвалюцыі 1918 г., расклала рабочую клясу і замест таго, каб весьці рэвалюцыю наперад да дыктатуры пралетарыяту і сацыялізму, што выклікалася-б абавязкам пралетарскай партыі, яна ў саюзе з буржуазіяй і кайзэраўскімі генэраламі разграміла пабудаваньне рэвалюцыйных мас і пакла на початак глыбокаму расколу рабочай клясы ГЕРМАНІІ. Яна пад сьцягам супрацоўніцтва з буржуазіяй і тактыкі «меншага зла», у саюзе з буржуазіяй і пры ўхваленьні ўсяго II Інтэрнацыяналу, працягвала гэту палітыку жорстких запрасей супроць рэвалюцыйнага руху ніх дзён. Яна закрыла Саюз чырвоных франтавікоў, забараніла рэвалюцыйныя рабочыя арганізацыі, забаранила і распусьціла рабочыя дэманстрацыі, арыштавала рэвалюцыйных і палітычных стачкі супроць наступленьня капіталу і фашызму і падтрымлівала ўладу контрэвалюцыйнай буржуазіі. Сацыял-дэмакратыя канцэнтравала ў руках сваёй карумпаваный бюракратычнай верхавіны кіраўніцтва масавымі рабочымі арганізацыямі. Яна выключала з іх рэвалюцыйных рабочых і сеткай падначаленых ёй цэнтралізаваных рабочых арганізацый зьявала ініцыятыву рабочых мас, падарвала іх баяздольнасьць у барацьбе супроць капіталу і фашызму і перашкодзіла дець рашучы адпор наступаючай фашысцкай дыктатуры і тэрарыстычным фашысцкім бандам. Гэта палітыка барацьбы супроць рэвалюцыйных мас, супрацоўніцтва з буржуазіяй і дапамогі рэакцыі пад прычынай тактыкі «меншага зла», была і ёсьць палітыка ўсяго II і Амстэрдамскага інтэрнацыяналаў, пачынаючы з 1914 году да цяперашняга часу.

Вэймарская «дэмакратычная» буржуазная рэспубліка ва ўмовах імпэрыялізму, тым больш у пераможанай у імпэрыялістычнай вайне краіне, капіталізм якой глыбока падарван агульным крызісам капіталістычнай сыстэмы, магла быць толькі рэакцыйнай дыктатурай буржуазіі. Рабочае заканадаўства, страхаваньне і дэмакратычныя правы, якія буржуазія вымушана была даць рабочым у гады рэвалюцыі, паступова адбіраліся ад рабочых ставшай на чале ўлады вэймарскай кааліцыяй, якая складалася з сацыял-дэмакратаў, партыі цэнтру і «дэмакратаў». Паступовыя і бязупынныя ўступкі рэакцыі, паступовае скасаваньне аднаго пункту канстытуцыі за другім, аднаго заваяваньня рабочых за другім, паступовая фашызацыя ўсяго дзяржаўнага апарату настолькі дыскрэдытавалі вэймарскую кааліцыю і вэймарскую рэспубліку, што яны страцілі колькі-небудзь сур'ёзнае значэньне ў вачох шырокіх мас.

Вэрсальская сыстэма зграбіла Германію і паставіла германскія працоўныя масы пад уціск нязноснай эксплёатацыі ня толькі свайго, але і замежнага капіталу, якому германскі ўрад павінен быў перавозіць рэпарацыйныя плацілы. Гнёт Вэрсаля, памножаны на гнёт «свайго ўласнай» нямецкай буржуазіі, прывёў да нябывалага заняпаду жыцьцёвага ўзроўню пралетарыяту і да тыкога зьбядненьня сялянства і дробнай буржуазіі гораду, пры якім частка сялянства і гарадзкой дробнай буржуазіі ня ўсё большай меры сталі пачуць сваім ідэалам дзвяную Германію, у якой яшчэ ня было агульнага крызісу капіталізму і ня было такога зьбядненьня мас, як цяпер. Зразумела таму, што ў момант мацнейшага эканамічнага крызісу, пагыбіўшага цяжар знадворнага, вэрсальскага нацыянальнага гнёту, і ў сувязі з тым, што пралетарыят аказаўся на віне сацыял-дэмакратыі раскопатым і, значыць, недаволі моцным для таго, каб павесьці за сабой гарадзкія дробна-буржуазныя і сялянскія масы, у гэты момант ня мог ня выбухнуць і сапраўды выбухнуў бурны ўзрыў нямецкага нацыяналізму і шавінізму, значна ўмацаваўшы палітычнае становішча буржуазіі і вынесшы на паверхню най больш дэмагагічную нацыяналістычную партыю — партыю «нацыянал-сацыялістаў».

Камуністычныя рабочыя арганізоўвалі і вялі барацьбу супроць наступленьня капіталу і фашызму. Яны падтрымлівалі ўсялякае малейшае выступленьне сацыял-дэмакратычных рабочых супроць капіталу, дзе толькі такія выступленьні мелі месца. Жадаючы аднавіць рэвалюцыйнае адзінства рабочай клясы, яны лішчэ задоўга да перамогі фашызму ня раз прапаноўвалі сацыял-дэмакратычным рабочым і незвым сацыял-дэмакратычным арганізацыям адзіны фронт для барацьбы супроць буржуазіі і яе пёкаў—фашыстаў. Але сацыял-дэмакратычныя рабочыя, якія вядуць за сабой большасьць рабочай клясы Германіі, будучы скованы сваім сацыял-дэмакратычным кіраўніцтвам, што стаіць супроць рэвалюцыйнага адзінага фронту і захоўвае свой рэакцыйны адзіны фронт з буржуазіяй, кожны раз адмаўляліся ў масе сваёй ад адзінага фронту з камуністамі і зрывалі барацьбу рабочай клясы. У той час, як камуністы бараніні РЭВАЛЮЦЫЙНЫ адзіны фронт рабочай клясы СУПРОЦЬ БУРЖУАЗІІ, СУПРОЦЬ ФАШЫЗМУ, сацыял-дэмакратыя, наадварот, штурхала рабочых у бок РЭАКЦЫЯНАГА адзінага фронту з буржуазіяй СУПРОЦЬ КАМУНІСТАЎ, СУПРОЦЬ КАМУНІСТЫЧНЫХ РАБОЧЫХ, разграмляючы і падварэчваючы рэформізм камуністычныя арганізацыі звэйсды і ўсюды, калі і дзе была для гэтага магчымасьць.

Ажыцьцяўляючы сваю лінію барацьбы за рэвалюцыйнае адзінства рабочай клясы супроць сацыял-дэмакратычнага адзінага фронту з буржуазіяй, камуністычная партыя, як адзіны рэвалюцыйны кіраўнік германскага пралетарыяту, ня гледзячы на штрэйкбрэхэрства сацыял-дэмакратыі і справе адзінага фронту супроць буржуазіі, закліканага разбочыць клясу ДА ЎСЕАГУЛЬНАЙ ПАЛІТЫЧНАЙ ЗАБАСТОЎКІ 20 ліпеня 1932 г., калі фашысты разагналі сацыял-дэмакратычны прускі ўрад і 30 студзеня 1933 г., калі да ўлады ў Германіі прышоў Гітлер, і прапанавала для правядзеньня такой забастоўкі адзіны фронт сацыял-дэмакратычнай партыі і рэфармісцкім прафсаюзам. Разьбіцьцё барацьбы пралетарыятам супроць буржуазіі і фашызму і ўсеагульная забастоўка прывялі-б да таго, што хістнія працоўныя масы сялянства і гарадзкой дробнай буржуазіі пашлі-б за пралетарыятам. Але сацыял-дэмакратыя, працягваючы сваю ранейшую палітыку і зрынутаючыся на далейшае супрацоўніцтва з буржуазіяй, зьявала ініцыятыву мас сеткай ідучых за ёй цэнтралізаваных арганізацый, у першую чаргу рэфармісцкіх прафсаюзаў і перашкодзіла арганізацыі ўсеагульнай забастоўкі, сарвала яе, заахвочваючы тым самым далейшае наступленьне фашыстаў супроць пралетарыяту. У рэзультаце авангард рэвалюцыйнага крыла германскага пралетарыяту—камуністычная партыя—аказаўся пазбаўленым падтрыманьня з боку большасьці рабочай клясы.

Пры такіх абставінах пралетарыят апынуўся ў такім становішчы, калі ён ня мог, і сапраўды ня змог, арганізаваць неадкладна і рашучы ўдар супроць дзяржаўнага апарату, уключыўшага ў свой склад для барацьбы супроць пралетарыяту баявыя арганізацыі фашысцкай буржуазіі, штурмовыя атрады, «Сталёвы шлем», рэйхсвэр. Буржуазія бяз сур'ёзнага адпору змагла перадаць дзяржаўную ўладу ў краіне ў рукі нацыянал-сацыялістаў, выступаючых супроць рабочай клясы сродкамі правакацыі, крывавага тэрору і палітычнага бандытызму.

Аналізуючы ўмовы ПЕРАМОЖНАГА паўстаньня пралетарыяту, Ленін гаварыў:

«Рашучы бой можна лічыць зусім насьпеўшым, КАЛІ «ўсе варожыя нам клясавыя сілы ДАВОЛІ заблыталіся, ДАВОЛІ перабіліся адны з другімі, ДАВОЛІ высіпілі сябе барацьбой, якая ім не па сілах», КАЛІ «ўсё тыя, што хістаюцца, вагаюцца, няўстойлівыя, прамежныя элемэнты, г. зн. дробная буржуазія, дробна-буржуазная дэмакратыя ў адрозьненьне ад буржуазіі ДАВОЛІ выкрылі сябе перад народам, ДАВОЛІ апа геніліся сваім практычным банкрутствам», КАЛІ «ў пралетарыяце пачаўся і стаў магутна ўзьнімацца масавы настрой у карысьць падтрыманьня самых рашучых, самаахвярна-адважных рэвалюцыйных дзеяньняў супроць буржуазіі. Вось тады рэвалюцыя насьпела, вось тады наша перамога, калі мы правільна ўлічылі ўсе намечаныя вышэй... умовы і правільна выбралі момант, наша перамога забясьпечана».

Характарная вобласьць абстаноўкі ў момант гітлераўскага перавароту заключаецца ў тым, што гэтыя ўмовы пераможнага паўстаньня не пасьпелі яшчэ насьпець да таго часу, — яны мелі ся толькі ў зародкавым стане.

Што датычыць авангарду пралетарыяту — камуністычнай партыі, — дык ён, не жадаючы ўпасьці ў авантурызм, ня мог, зразумела, кампэнсаваць свайміі дзеяньнямі гэты нехапаючы фактар.

«З адным авангардам, — гаворыць Ленін, — перамагчы нельга. Кінуць адзін толькі авангард у рашучы бой, пакуль уся кляса, пакуль шырокія масы не занялі пазыцыі або простага падтрыманьня авангарду, або, прынамсі, добрапажаданага нэйтралітэту ў адносінах да яго... было-б ня толькі глупствам, але і злачынствам».

Такавы акалічнасьці, вызначаўшыя адступленьне рабочай клясы і перамогу партыі контр-рэвалюцыйных фашыстаў у Германіі.

Такім чынам, устанаўленьне фашысцкай дыктатуры ў Германіі зьяўляецца ў канчатковым разрахунку вынікам сацыял-дэмакратычнай палітыкі супрацоўніцтва з буржуазіяй на працягу ўсяго існаваньня Вэймарскай рэспублікі. Сацыял-дэмакратыя ня раз заяўляла, што яна ня будзе мець нічога супроць таго, калі Гітлер прыдзе да ўлады «канстытуцыйным» шляхам. Ужо пасьля прыходу да ўлады Гітлера, 2 лютага «Форвэртс» заяўляе, што без сацыял-дэмакратыі такі чалавек, як Гітлер, ня мог-бы быць рэйхсканцлерам. Тое самае заяўляў Вэльс 23 сакавіка ў сваёй дэклярацыі перад рэйхстагам, сказаўшы, што заступі сацыял-дэмакратаў перад «нацыянал-сацыялістамі»

УСЕБЕЛАРУСКІ КОНКУРС НА ЛЕПШАЕ СЕЛЬСКАЕ СПАЖЫЎТАВАРЫСТВА

МНОЖЫЦЬ РАДЫ ЎДАРНІКАЎ КААПЭРАЦЫІ

У часе конкурсу дабʼемся максымальнага павялічэньня клопатаў аб перадавікох калгасных палёў і лепшых аднаасобніках

На перадавыя пазыцыі барацьбы за сяўбу!

Павярнуць усю работу тварам да задач сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі, арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, узьніму ўраджайнасьці. Такія задачы пастаўлены партыяй перад сыстэмай спажывецкай кааперацыі. **Спажывецкая кааперацыя павінна выйсьці на перадавыя пазыцыі барацьбы за бальшавіцкую сяўбу.**

Вялікую ініцыятыву ў гэтых адносінах праявіла спажывецкае таварыства в. Мачэха, Палтаўскага раёну. Яно здолела так перабудаваць усю сваю работу, каб забясьпечыць пасьпяховае выкананьне задач веснавой сяўбы. Вопыт гэтага таварыства павінен стаць здабыткам усіх ССТ Беларусі.

Што зрабілі, чаго дабіліся мачэхаўцы? Яны дабіліся цеснай увязкі плянаў сельспажыўтаварыства з вытворчымі плянамі калгасаў. Яны ўключылі свой актыў у практычную, штодзённую працу калгасаў, яны шырока ўкаранілі ў практыку работы прычыны пераважнага снабжэньня перадавых калгасаў, ударных калгасных брыгад і лепшых-ударнікаў-калгаснікаў. Яны дасягнулі абязьлічку ў снабжэньні. Яны ўжылі таварны байкот у адносінах да лодыраў, прагульшчыкаў і рвачоў. Працоўная вяжка калгасьніка стала асноўным заборным дакумантам. Яны паставілі ўсю сыстэму снабжэньня праз крамы гандаль і разводку на службу веснавой сяўбе, павышэньню прадукцыйнасьці працы і калгаснай вытворчасьці.

Вялікай увагі заслугоўвае вопыт Мачэхскага спажыўтаварыства па заключэньні сацдагавораў з калгаснымі брыгадамі на выкананьне задач веснавой сяўбы.

Мачэхскае сельспажыўтаварыства выклікала на сацспаборніцтва ўсе спажывецкія таварыствы Савецкага саюзу.

Спажывецкая сыстэма БССР павінна падхапіць гэты выклік і ўключыцца ў сацспаборніцтва на лепшае абслугоўваньне веснавой сяўбы.

Дагэтуль нашы спажывецкія таварыствы мала зрабілі, каб перабудаваць сваю работу. Толькі некаторыя райсаюзы, у першую чаргу Слуцкі, дабіліся пэўных посьпехаў у гэтай галіне. Зьмешчаныя сёньня матар'ялы аб дзейнасьці Горацкага, Полацкага і Хойніцкага райсаюзаў гавораць аб нанавальнай старых мэтадаў работы.

Конкурс сельспажыўтаварыстваў, які зараз абвешчан, павінен даць рашучы пералом, ліквідаваць адставаньне спажывецкай кааперацыі ў абслугоўваньні веснавой пасеўнай кампаніі.

Вялікая роля прыпадае тут на цэнтральны, раённы і нізавы друк.

— Разгарнуць жорсткую крытыку недахопаў у рабоце кааперацыі, папулярызаваць лепшы вопыт ударных сельспажыўтаварыстваў, паказаць практычныя шляхі перабудовы работы, падцягваць адсталых, множыць калёны перадавікоў, дабіцца, каб спажывецкая сыстэма БССР па-баявому падрыхтавалася да сяўбы, — вось задачы, якія стаяць перад друкам.

Наш друк павінен неадкладна ўключыцца ў конкурс, стаць застрольшчыкам і арганізатарам сацспаборніцтва ў спажывецкай сыстэме.

Выклік мачэхаўцаў прыняты. Адкажам на заклік ударнікаў кааперацыі бальшавіцкай справай! Вывезем кааперацыю БССР у перадавыя рады байцоў за бальшавіцкую сяўбу!

ПАПЯРОВАЕ КІРАЎНІЦТВА — ЗАМЕСТ ЖЫВОЙ СПРАВЫ

Работа Хойніцкага і Полацкага райспажыўсаюзаў служыць наглядным доказам таго, як нельга адносіцца да перабудовы працы спажывецкай кааперацыі.

Возьмем **Хойніцкі** райсаюз. Дагэтуль не адкрыта ні адна новая вясковая крама. Між тым у пратаколе па сядзяньня праўленьня фігуруе пункт аб адкрыцьці да веснавой пасеўнай кампаніі раду крам у вёсках і калгасах.

Райсаюз фармальна выканаў дырэктыву Белкаапсаюзу аб арганізацыі чырвоных і чорных дошак у вясковых крамах для стымулюваньня ўзьдыму калгаснай вытворчасьці. Дошкі арганізаваны толькі ў центры, дзе зна ходзяцца сельспажыўтаварыствы.

Не налажан улік ударных калгасных брыгад і лепшых калгаснікаў. Адсюль—фармальныя адносіны да задачы пераважнага снабжэньня ўдарнікаў. Сельспажыўтаварыствы абмежаваліся арганізацыяй паліц ударнікаў, водпускам калгасам тавараў на 2 тыс. руб., прычым кааператары не ведаюць, якія калгасы і хто з калгаснікаў заслугоўвае лепшага снабжэньня.

Дагэтуль не заключаны сацдагаворы паміж сельспажыўтаварыствамі і калгаснымі брыгадамі. Райсаюз супакойвае сябе тым, што гэта пытаньне абгаворвался на папярэдніх пасяджэньнях праўленьня ССТ.

У пратаколе запісан пункт аб арганізацыі брыгад для агляду калгаснага каня. Агляд не праведзен дагэтуль.

Да апошняга часу яшчэ не адкрыты вызначныя навідэлі плянаў 5 сталовак у калгасах. Як мы бачым, далей рэзалюцый і пратаколаў работа не пайшла. Жывая справа падменена папяровым кіраўніцтвам.

Такі-ж малюнак мы назіраем у Полацку. Райсаюз не мае ніякіх вестак аб тым, колькі вытворчых дагавораў заключана з калгаснымі брыгадамі. Няма таксама ніякага ўліку вышкаў правезеных пры ССТ нарад па пытаньнях аб сяўбе. Чорныя і чырвоныя дошкі пры сельскіх крамах не арганізаваны. Замест арганізацыі пераважнага снабжэньня лепшых калгасаў, полацкія кааператары пашлі па шляху выдачы выпадковых прэмій. Яны такім чынам дапусьцілі скажэньне прынцыпу падпарадкаваньня снабжэньня задачам узьдыму калгаснай вытворчасьці. Да гэтага трэба дадаць, што намечаныя плянам новыя сталоўкі яшчэ не арганізаваны.

Абвешчаны конкурс на лепшае сельспажыўтаварыства павінен прымусіць хойніцкіх і полацкіх кааператараў пабаявому ўзяцца за работу.

С. П.

На пасяджэньні цэнтральнай конкурснай камісіі

На першым пасяджэньні цэнтральнай конкурснай камісіі абмяркован і зацьверджан рад арганізацыйных пытаньняў.

— Зацьверджан каляндарны плян работы конкурснай камісіі, які, між іншым, прадугледжвае заслухаць рад даклада́ў з месц аб ходзе конкурсу і правесьці выязныя пасяджэньні цэнтральнай конкурснай камісіі ў раёнах.

— З апарату Белкаапсаюзу мабілізавана 25 адказных работнікаў, якія камандыруюцца ў раёны для разгортваньня конкурсу на лепшае абслугоўваньне веснавой сяўбы. Аднаму з членаў конкурснай камісіі даручана дагаварыцца з ЦК ЛКСМБ і ЦП саюзу работнікаў кааперацыі і дзяржгандлю выдзеліла пуцёўкі ў дамы адпачынку і на курорты для лепшых удзельнікаў конкурсу. На месцох таксама стварацца прэміяльныя фонды.

— Для кіраўніцтва ўсёй работай па правядзеньні конкурсу сельспажыўтаварыстваў на месцох арганізуюцца раённыя конкурсныя камісіі ў складзе прадстаўнікоў райспажыўсаюзу, райкому саюзу работнікаў кааперацыі і дзяржгандлю і раённай газэты.

— Аправа ўжо выначаных прэмій для лепшых сельспажыўтаварыстваў, вызначан спэцыяльны таварны фонд у суме 5 тыс. руб. для прэміяваньня лепшых рабселькораў, насьцешных, раённых газэт і карэспандэнтаў, якія прымуць актыўны ўдзел у конкурсе сельспажыўтаварыстваў на лепшае абслугоўваньне веснавой сяўбы. ЦП саюзу работнікаў кааперацыі і дзяржгандлю выдзеліла пуцёўкі ў дамы адпачынку і на курорты для лепшых удзельнікаў конкурсу. На месцох таксама стварацца прэміяльныя фонды.

М. Ч.

Штампаванымі адказамі прыкрываюць бязьдзейнасьць

Горацкі райспажыўсаюз ня выканаў дырэктыў партыі аб лепшым абслугоўваньні пасеўнай кампаніі. Райспажыўсаюз ня ведае, што наогул робіцца ў сельспажыўтаварыствах. Ён абмежаваўся тым, што спусьціў у нізоўку цыркуляры аб уключэньні ў конкурс на лепшае ССТ.

Прагляд адабранага да сяўбы ільнанасеньня

На пытаньне, на якую суму адпушчана тавараў калгасам, саўгасам і прадпрыемствам, на фабрыцы палітэхнічнай школы на 60 чал., курсаў па тэхніцы бясьпечнасьці на 8 чал.

Рад практычных мерапрыемстваў намечан у галіне перабудовы аплаты працы. Дзяжурныя сьлесары, вадаправодчыкі, электраманцёры з 10-га мая пераводзяцца на прэміяльную сыстэму аплаты, а канторска-рахункові апарат з 25 красавіка — на простую зьдзельшчыну. Уводзіцца прэміраваньне ІТР за перавыкананьне плянавых заданьняў. Ахоп рабочых фабрыкі зьдзельшчынай павінен быць даведзен да 95 проц. Для вядучых прафэсый — вакум-апаратчыкаў, варачнікаў, рабочых машыннага адцраленьня зьдзельная аплата павышаецца на 10 проц. Унесен разьдзел аб парадку аплаты за прастой і брак, з канкрэтнымі пунктамі — які брак і па якіх прычынах. Устаноўлены каляндарныя тэрміны ахопу рабочых тэхнарманаваньнем.

Новым зьяўляецца разьдзел — «рабочае снабжэньне і быт». Кіраўніцтва фабрыкі абавязалася пашырыць сьвінарнік з 43 галоў да 100, трусатнік з 500 да 2.000 галоў, кароўнік з 7 да 10. ЗРК выдзяляецца 19.000 руб. для папаўненьня зваротных сродкаў. На капітальнае будаўніцтва, па рабочым снабжэньні, пабудову гарадняхавальнікаў і г. д. — адпушчана 29.000 руб. Акрамя гэтага, адміністрацыя абавязалася даць каня для перавозкі прадуктаў у сталоўку, не пазьней 15 мая арганізаваць ларок пры фабрыцы, абсталяваць спэцыяльны пакой у сталоўцы для ўдарнікаў і ІТР, і раздаць рабочым для разьвязеньня трусагадоўлі на даму 250 трусоў.

Для абсталяваньня інтэрнату фабрыкі адпускаецца 8.000 руб., на ахову працы — 10.000 руб.

Пры праверцы і абмеркаваньні калдагавору мелі месца яўна рвацкія настроі. У мякка-шакалядным цэху адзін з брыгадзіраў выступіў супроць перагляду зьніжаных норм. Гэта сустрэла рашучы адпор з боку рабочых.

К.

У тэрмін скончыць перазаключэньне калдагавору

(Ад нашага ўласнага карэспандэнта)

РЭЧЫЦА. З вялікім спазьненьнем разгортвалася калдагаворная кампанія. Да апошніх дзён многія ФЗМК бязьдзейнічалі (завод імя Варашылава, МТС і інш.).

Па саюзу лесасплаў перазаключэньне калдагавораў знаходзіцца пад пагрозай зрыву. Для правядзеньня работы па калдагавору прыехаў прадстаўнік ЦП саюзу лесасплаву **Гасман**, які фармальна выканаў свой абавязак — правёў адно пасяджэньне мясцкому (27 сакавіка) і паехаў, забыўшыся пакінуць гонгоды (узяў з сабою), без якіх на месцы нічога ня робяць. Мясцком-жа пакуль што не арганізаваў ні адной самаправераччай брыгады па перазаключэньні калдагавору.

Прадстаўнік ЦП сельпраму **Савіч** аказаў амаль такую-ж «дапамогу», як і Гасман. Прасядзеў каля месяца, а што зрабіў, і сам добра ня ведае.

Ня лепш і па МТС. Там нічога яшчэ ня зроблена. РПС зьняў з работы за бязьдзейнасьць старшыню рабочкому **Рудзіка** і на гэтым сваю работу скончыў.

Толькі 26 сакавіка склалі 5 самаправераччых брыгад, якія і да гэтага часу не разгарнулі работы. Удзел рабочых у праверцы старога калдагавору зусім слабы. З наяўных членаў саюзу 119 чалавек, прымала ўдзел у праверцы калдагавору толькі 31 чал., а слухачыя зусім ўдзелу ня бралі.

Партыйная ячэйка МТС адзае зусім слабую ўвагу гэтай рабоце. Яна толькі ўстанавіла тэрмін скончэньня заключэньня калдагавору. Вялікая віналяжыць па ЦП саюзу, бо да гэтага часу ня прысланы гонгоды і ляміты.

Значную дапамогу ў правядзеньні калдагаворнай кампаніі аказаў прадстаўнік ЦП саюзу земляробчых рабочых тав. **Бершэўскі**. Па саўгасах шырока разгорнута масавая работа сярод рабочых па ўдзелу ў праверцы старога калдагавору. За час кампаніі ад рабочых саўгасу паступіла шмат каштоўных прапаноў.

Добра праведзена гэта работа па саюзу працасьветы. Прадстаўнік ЦП тав. **Левін** аказаў немалую дапамогу ў праверцы калдагаворнай кампаніі. Па камбінату «Х Кастрычнік» прадстаўнік ЦП саюзу дрэваапрацоўшчыкаў тав. **Празднікаў** паказаў сапраўды ўдарныя тэмпы работы. Вялікую дапамогу тут аказаў рабочы калектыў пад кіраўніцтвам парторгаў ячэйкі. Ня дрэнна працаваў фабком. Па-ўдарнаму ўзяліся за правядзеньне кампаніі. Было арганізавана 49 самаправераччых брыгад, у якіх прымала актыўны ўдзел 490 рабочых. Праект новага калдагавору абмяркоўваўся на сходах партыйнага, прафэсыянальнага і камсамольскага актыву. У першыя дні праверкі калдагавору паступіла 85 рабочых прапаноў — 8 рацыяналізатарскіх.

Эканомія зарплаты за кошт перагляду заніжаных норм складае ў суткі 148 руб. 67 кап. За лоты і сакавік камбінат мае эканомію па заработнай плаце на 7.285 руб. за кошт уключэньня ў новы тарыфны даведнік. Дабіліся эканомі па зарплаце за лоты і сакавік на 11.037 руб. Разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва паміж брыгадамі. Арганізавана 10 новых ударных брыгад з ахопам 206 чалавек. Камбінат «Х Кастрычнік» выклікаў на сацыялістычнае спаборніцтва барысаўскі камбінат.

За час калдагаворнай кампаніі дасягнуты вялікія посьпехі ў выкананьні прамфінпляну. За сакавік замест 23.000 скрынак экспарту выпрацавалі 40.000 скрынак. Квартальны плян выкананы на 102 проц.

Гэтымі-днямі будуць заключаны дагаворы па іншых прадпрыемствах Рэчыцы. Необходна ўлічыць памылку камбінату «Х Кастрычнік» і правесьці сапраўднае новага калдагавору пры актыўным удзеле ўсіх рабочых.

Дашкевіч.

МАШЫНЫ НА КАЛГАСНЫХ ПАЛЁХ

Барбарскія адносіны да каня

(З лістоў калгасьнікаў)

Важнейшая пастанова партыі і ўраду аб захаваньні конскага пагалоўя ў радзе калгасаў не знайшла яшчэ свайго практычнага ажыцьцяўленьня. Паасобныя гаспадарнікі не навучыліся цаніць каня, а клясава-варожыя элементы скарыстоўваюць гэты вучастак для таго, каб сарваць веснавую сяўбу. Можна прывесьці рад фактаў нядбайных, а то і проста злачынных адносін да калгаснага каня.

У калгасе «Будзённы», Бягомльскага раёну, проста зьнішчаюць конское пагалоўе. Слабых коняй ня кормяць, а чакаюць, пакуль яны здохнуць. Такія адносіны да каня наглядаюцца на працягу ўсяго году. Па віне Пракаповіча, які быў у мінулым годзе конюхам, загінула 7 коняй. Наогул, калгас «Будзённы» засьмечан варожымі элемэнтамі. На чале калгасу стаіць Ціхановіч—былы кантрабандыст. Жы вёлагадоўчай фэрмай загадвае выключаны з партыі Шлейфэр. Работа гэтых людзей нікім не кантралюецца, праўленьне калгасу ўжо 4 гады як не перавыбіралася.

Прыклад ганебных адносін да каня паказвае дырэктар саўгасу «Любань», Пухавіцкага раёну, **Кацан**. Ён накладае на коняй цяжкія вазы, а калі які-небудзь з іх не бяро воза, ён б'е палкаю, калом і г. д. Сакратар партячэйкі **Важнік** падтрымлівае Кацана і стараецца апраўдаць яго дзеяньні.

Амаль аналёгічныя выпадкі заўважаюцца з боку старшыні Гусьлеманскага сельсавету, Магілеўскага раёну, **Хрысьціневіча**. Маладога трохгадовага каня ён заезьдзіў так, што апошні ўжо два месяцы стаіць у хляве з аблезлай скурай і не атрымлівае ніякай дапамогі. Партячэйка не рэагуе на падобныя факты.

Ня выконваецца пастанова ЦК аб ахове конскага пагалоўя ў вёсцы Насовічы, Зяленецкага сельсавету, Мазырскага раёну. Шкоднікі зьнішчаюць добрых коняй. Так, Пілішенка замарыў голадам свайго каня, які каштаваў 600 руб. Робіць ён гэта таму, што зьбіраецца пайсьці ў калгас. Доўгі, Пілішенка В. і Баракун купляюць коняй і рэжуць іх на мяса.

У справе падрыхтоўкі коняй да веснавой сяўбы вялікую ролю адыгрываюць вэтэрынарныя ўставы. Але вэтлячэбніца Дзяржынскага раёну выконвае свае абавязкі кепска. Пра яе дрэнную работу пісала газэта «Савецкая Беларусь», аднак, гэта не палепшыла справы. Загадчык вэтлячэбніцы **Герынг** замест дапамогі калгасам па ахове коняй займаецца капойкамі і бязьдзейнічае. У вэтлячэбніцы па працягу толькі аднэй пяціднёўкі загінула 7 коняй. Хворыя, галодныя коні бадзяюцца па вуліцы. Кармы, якія ім адпускаюцца, ідуць сьвіньням і курам Герынга.

У кіраўніцтва вэтлячэбніцы пралезлі шкоднікі. Герынг прыняў на работу вэтэрынарнага доктара Ліпецкага, які рабіў прышчэпкі сьвіньням і трусам у калгасах «Беларусь», «Ударнік», «Беларускі батрак», Вазяранскага сельсавету. Уся жывёла, якой была зроблена прышчэпка, загінула. Рвацтва — асноўны прынцып работнікаў вэтлячэбніцы. Герынг і Ліпецкі за кожную дапамогу патрабуюць ад калгасаў шпаніцу, жыта і інш. прадукты. Вэтработнікі стараюцца, каб аб іх ганебнай бязьдзейнасьці ніхто ня ведаў. Санітарку Бранявіцкую на кожным кроку зьневажаюць за тое, што яна расказала, ад чаго гінуць у вэтлячэбніцы коні.

Усе гэтыя факты гавораць за тое, што рад калгасаў яшчэ не гатоў да веснавой сяўбы. Такое становішча зьяўляецца небясьпечным. Калгасы павінны падцягнуцца і сапраўды пабальшавіцку правесьці сяўбу.

Група сельскораў.

САЎГАС „НЕСЯТА“ ДА СЯЎБЫ НЕ ПАДРЫХТОВАН

Саўгас «Несята»—адзін з найбольш буйных гаспадарак Клічаўскага раёну. Ён забясьпечан высокакваліфікаванымі кадрамі і мае ўсе магчымасьці, каб быць узорным. Але трыкутнік саўгасу не стараецца гэтыя магчымасьці ператварыць у жыцьцё. Ужо адзін той факт, што саўгас не гатоў да веснавой сяўбы гаворыць аб адсутнасьці барацьбы за выкананьне прамфінпляну.

Цягавая сіла саўгасу знаходзіцца ў вельмі дрэнным становішчы. Амаль 50 проц. рабочых коняй хворыя і ня могуць працаваць. Ня лепш справа з сельска-гаспадарчым інвэнтаром. За ўвесь час падрыхтоўкі да сяўбы ня было зроблена ніводнага пробнага выезду.

Сталоўка саўгасу не падрыхтавалася да выкананьня тых задач, якія ўскладаліся на яе вясной. Яна не забясьпечана на час ударнай работы бульбай, крупой, хлебам і іншымі прадуктамі. Дзіцячыя ясьлі, якія арганізаваў гарздраў, працуюць з перабоямі. Дырэкцыя саўгасу не паклапацілася забясьпечыць іх дрывамі і неабходным абсталяваньнем. Затое пайкі, якія вызначаюцца для ясьляй, часта разьмяркоўваюцца паміж адміністрацыяй саўгасу. У лютым ясьлі наведвала толькі 20—25 чалавек, а прадуктаў атрымалі на 50 дзяцей. Палова атрыманых прадуктаў пайшла на карысьць трыкутніку.

Фактаў самазабесьпячэньня можна прывесьці даволі многа. У мінулым годзе начальства забрала сабе ўвесь ураджай яблык. Аб гэтым ведала РКК-РСІ, але яна наўмысьля замазала факты. Кантралёр саўгасу Талкачоў, пры дапамозе старшыні рабочкому, узяў сабе 40 мэтраў мануфактуры.

Ніякай палітыка-выхаваўчай работы ў саўгасе не вядзецца. Гэта прывяло да таго, што сярод найбольш адсталай часткі распаўсюджваюцца думкі аб тым, што саўгас хутка разваліцца. Належнай барацьбы з боку грамадзкіх арганізацый саўгасаў з такімі думкамі няма.

По даручэньні камсамольскага сходу саўгасу — ЛІСОЎСКІ, ЗЕНАЎ, РАГАЎКОЎ.

Ад рэдакцыі: «Зьвязда» чакае адказу па гэтаму лісту ад Клічаўскай РКК-РСІ.

По сьлядох неапублікаваных лістоў

* * *

Карманская РСІ паведамляе, што заметка селькора Селязьнеева «Аб развале калгасу «Чырвоная ветка», Спуменскага сельсавету» адпавядае сапраўднасьці.

Старшыня калгасу Капцай Н. за шкодную работу і падтрымліваньне кулакоў арыштаваны. Члена сельсавету Агеенкава, як кулака, прэзыдыум сельсавету аддаў пад суд, а сакратара Спуменскага сельсавету Сарвіра партячэйка сьвяла з работы.

* * *

Допіс А. М. «Аб шкоднікай рабоце ў калгасе «Полымя» Сіроцінскай РКК-РСІ праверан, факты пацьвердзіліся. Брамеесў, былы старшыня калгасу «Полымя», Сіроцінскага сельсавету, за разбазаваньне ільнавалакна, пашкоді і бесгаспадарчасьць судзіўся, зараз знаходзіцца ў папраўчым доме. Старшыня калгасу Тамашэвіч за разбазаваньне калгаснага збожжа перадан сьледчым органам. Шабрынскі М. за продаж калгаснага каня аддан пад суд.

* * *

Матар'ял двух селькораў «Камуніст з партоблетам запамажа кулаку» Капыльскай РК КП(б)Б праверан. Факты пацьвердзіліся. Загадчык Марко з работы ў МТС зьнят. Вінаватыя ў вымёне яго на работу прыцягнуты да партадказнасьці.

* * *

Брагінская РКК-РСІ паведамляе, што допіс лёгкай кавалерыі аб злачынствах у калгасе імя Варашылава пацьвердзіўся. Праўленьне калгасу за разбазаваньне калгаснай маемасьці распушчана. Старшыня калгасу Цытыркін зьнят з работы і прыцягнут да партыйнай адказнасьці. Брыгадзір Байдаю Е. і кладаўшчык Смусенка А. за раскрадваньне калгаснай маемасьці прыцягнуты да судовай адказнасьці і зараз знаходзяцца пад вартай.

* * *

Матар'ял селькора Пчала «Аб кулацкіх дзеяньнях Шарбунова Васіля» Чэрыкаўскай РСІ праверан. Факты пацьвердзіліся. Кулак Шарбуноў В. ячэйкай КП(б)Б выключан з партыі, зьнят з работы старшыні калгасу «Аб'яднаньне», Верамеёўскага сельсавету, і аддан пад суд.

* * *

Талачынская РКК-РСІ праверыла допіс Кулінёўскага «Аб пронай рабоце ў Слаўгаўскім сельспажыўтаварыстве» паведамляе, што факты пацьвердзіліся. Сакратару Слаўгаўскай ячэйкі КП(б)Б Юркевічу за верагадзьнае ня самасьнабжэньне работнікаў сельспажыўтаварыства абвешчана вымоўка. Нам. старшыні сельспажыўтаварыства Гайдук і загадчык крамы Мегрык за самасьнабжэньне зьняты з работы. Старшыня сельспажыўтаварыства Бацыно і загадчык Іпатцеў знаходзяцца пад вартай.

У ВОРШЫ ПАСЕЎНЫЯ ГРУЗЫ ЗАТРЫМЛІВАЮЦЦА НА СТАНЦЫІ

Праз **Аршанскі** вузел да 1 красавіка прайшло каля 500 вагонаў з пасеўнымі грузамі. Лічба даволі вялікая. Ад чыгуначных арганізацый патрабавалася перабудаваць работу такім чынам, каб гэтых грузаў не затрымліваць, каб забясьпечыць бесьперабойнае іх прасоўваньне.

У сапраўднасьці-ж становішча зусім іншае. Прастоі—масавае зьявішча. Па віне кіраўнікоў станцыі Ворша ўсходняя і заходняя вагоны затрымліваюцца па 4 сутак і больш.

28 сакавіка, напрыклад, прыбыўшы на станцыю Ворша-заходняя вагон з пасеўнымі грузамі па віне дзяжурнага па станцыі Сьцепановіча быў затрыман на 16½ гадзін. Вагон № 493142 прастаяў на пуцях тры дні з прычыны таго, што ня было каму апломбаваць яго. Наогул справа з апломбаваньнем абязьлічана. Да гэтага часу ня вылучан спэцыяльны чалавек які-б адказваў за гэту работу.

На віне дзяжурных станцый **Чачот** ома і Сьцепановіча 26 сакавіка быў затрыман вагон на 15 гадзін. Вагон № 116499 прастаяў пад сартыроўкай больш двух сутак.

На станцыі Ворша-ўсходняя вагаўчыкамі працуюць Пішчарэнка, Кукальскі і Кавалеўскі. На іх усклаўдзеваюцца абавязкі весьці ўлік прасоўваньня пасеўных грузаў. Гэта адказьнейшая справа. Між тым вагаўшчыкі падбайна адносяцца да выкананьня сваіх абавязкаў.

2 красавіка па віне вагаўчыка **Кавалеўскага** прыбыўшыя падводы з пасеўнымі грузамі з базы Белсельснабу былі затрыманы з 9 гадзін раніцы да 4 гадзін дня, бо ў гэты час Кавалеўскі займаўся выдачай грузаў... прыватным асобам.

На станцыі Ворша-заходняя справа ўліку пасеўных грузаў пастаўлена таксама зусім дрэнна. Тут гэту работу даверылі проста «очковтирателям». Па іх вестках вагоны з пасеўнымі грузамі адпраўляюцца... раней чым прыбываюць на станцыю. Так, напрыклад, час адпраўленьня ст. Ворша-заходняя вагон № 341255, які накіроўваўся на станцыю Барысаў, і двух іншых вагонаў — на ст. Крупкі, памечан у кнізе ўліку раней прыбыцьця. У сапраўднасьці-ж гэтыя вагоны мелі 20 гадзін прастою. Так сьвядома давалі няправільныя весткі агенты па ўліку. Агенты **Плотух** і **Шляхцін** зусім не вялі ўліку пасеўных грузаў.

Агенты станцыі Ворша-цэнтральная нядбайна адносяцца да пасылкі пасеўгрузаў па маршрутах. У выніку грузы трапляюць не па прызначэньні. Так, 2 сакавіка вагон з пасеўнымі грузамі, які павінен быў-быць накіраван на станцыю **Бурбіна**, па віне агентаў **Чыжэўскай** і **Чарняўскага** быў засланы на ст. **Менск**.

23 сакавіка вагон гружаны пасеўнымі, з прычыны тэхнічнага браку быў падан у рамонт. Рамонт быў дробны і вагон павінен быў выйсьці праз кароткі час між тым ён прастаяў у рамонце 5 сутак. 24 сакавіка адзін вагон з тэхнічным бракам прастаяў 36 гадзін, другі вагон 56 гадзін і трэці 46 гадз.

31 сакавіка па прычыне непадачы паравоза цягнік, у складзе якога было 6 вагонаў з с.-г. грузамі, прастаяў лішніх 14 гадзін.

Служба эксплёатацыі на працягу 5 дзён не падавала ні аднаго вагона пад пакгаўзы для пагрузкі пасеўных грузаў.

Зусім абураючыя адносіны да разгрузкі пакгаўзаў з боку кліентуры. Прыбываючыя грузы пралежваюць цэлымі тыднямі, загружаюць пакгаўзы, затрудняюць нармальную работу станцыі, а кліентура зусім не клапоціцца аб своячасовым выкупе іх. Нібыта пастанова ўраду аб нечарговым выкупе пасеўных грузаў іх не датычыць. Нафтасклад, напрыклад, з 29 сакавіка не выкупляе 15 бочак змазачнага матар'ялу. Па 10 сутак не забірае сваіх грузаў Аршанская МТС, прыгарадная гаспадарка РТСТ і інш.

Паказаныя факты сьведчаць аб тым, што як з боку чыгуначных арганізацый, так і з боку кліентуры няма бальшавіцкай барацьбы за хуткую дастаўку грузаў на палі веснавой пасеўнай кампаніі. Задача заключаецца ў тым, каб неадкладна перабудаваць гэту работу, узмацніць кантроль, забясьпечыць па-зачарговае прасоўваньне с.-г. грузаў. Ні аднаго затрыманьня грузаў для пасеўнай кампаніі — такі баявы лёзунг чыгуначнай партыйнай арганізацыі і ўсіх чыгуначнікаў.

У ЭЎРОПЕЙСКІМ ТУПІКУ

Мусаліні выказваецца за рэвізію граніц

БЭРЛІН, 8. У «Бэрлінэр Бэрзэн Кур'ер» надрукован артыкул **Мусаліні** пад загалоўкам «Ідэя рэвізіі крочыць наперад».

Свой артыкул Мусаліні пачынае з крытыкі новага пакту Малой Антанты і сьцьвярджае, што гэты пакт асуджан на бясплённасьць з прычыны палітычных і эканамічных супярэчнасьцей паміж краінамі Малой Антанты. «З прычыны рэвізіяністкай хвалі ў Эўропе і ва ўсім астатнім сьвеце, — піша Мусаліні, — Малая Антанта старалася заняць дыямэтральна процілеглую пазыцыю, але ідэя рэвізіі крочыць наперад і будзе мацней, чым гнілыя рагаткі нейкага пратаколу. Палітыка Італіі ў гэтым далікатным пытаньні пасьлядоўная і проста лінейная. Я дадаю, што такая рэвізія, мэта якой зводзіцца да папярэджаньня новай ваеннай катастрофы, павінна быць праведзена пры дапамозе інструманту Ліґі нацый».

***

БЭРЛІН, 9. Згодна паведамленьня «Дойчэ Альгемэйнэ Цэйтунг», у маі ў Рым паедзе міністар прапаганды Гебэльс.

„Германія павінна атрымаць роўнапраўе ва ўсіх адносінах"

Заява газэты „Лёкаль Анцэйгер"

БЭРЛІН, 9. Сёньняшнія ранішнія газэты паведамляюць, што ўчора **Норман Дэвіс** меў доўгую гутарку з рэйхсканцлерам **Гітлерам** па пытаньнях аб раззбраеньні і аб сусьветнай эканаміч най канфэрэнцыі. У гутарцы прымаў удзел таксама міністар замежных спраў фон **Нэйрат**. Зьмест гутаркі не апублікован.

Гугенбэргаўская «Лёкаль Анцэйгер» думае, што Норман Дэвіс у асноўным выказаў тыя меркаваньні, якія ўчора ў афіцыёзнай форме выложыў у Вашынгтоне міністар замежных спраў ПАЗШ **Хэл**. «Лёкаль Анцэйгер» піша: «Спробы палепшыць эканамічныя ўзаемаадносіны паміж усімі краінамі сьвету правалятца, калі ня будуць зьменены даўно ўжо пастарэлыя пастановы вэрсальскага дагавору і калі Германіі ня будзе дано роўнапраўе ў Эўропе ва ўсіх адносінах».

„Эрнуэльд" аб пакце чатырох дзяржаў

ПАРЫЖ, 9. Заўтра савет міністраў павінен зацьвердзіць канчатковы тэкст францускага мэмарандуму аб праекце пакту 4-х дзяржаў. У сувязі з гэтым «Эрнуэльд» у артыкуле пад загалоўкам «Пахаваньне рымскага пакту» піша, што ад праекту застаўся толькі ўспамінак. Правал пакту 4-х дзяржаў газэта тлумачыць пратэстамі **Малай Антанты, Польшчы і Бэльгіі.**

„Увядзеньне намесьніцтва—шлях да манархіі"

БЭРЛІН, 9. У сувязі з законам аб намесьніцтве ў германскіх правінцыях, блізкая да ўрэду «**Дэйчэ Цэйтунг**» піша: «Нельга адмаўляць, што ўвядзеньне намесьніцтва становіць сабой набліжэньне да манархічных традыцый (назначэньне ўрадаў). Мы лічым магчымым, што ўвядзеньне намесьніцтва і сувэрэннага становішча намесьнікаў калі-небудзь выльецца ў форму манархіі, якая, на наша цьвёрдае перакананьне, рана ці позна закончыць і ўвянчае нацыянальную рэвалюцыю».

Японія імкнецца перашкодзіць прызнаньню СССР праз ПАЗШ

Візыт Мацуока ў Н'ю-Ёрку

Н'Ю-ЁРК, 7. Добра інфармаваны журнал «**Афэрс**», які выдаецца ў Вашынгтоне, асьвятляе дзейнасьць **Мацуока** ў ПАЗШ. Візыты Мацуока ў Рузвэльта і Хэла былі, — гаворыць журнал, — звонку галоўным чынам актамі ветлівасьці, але за кулісамі галоўныя памаганьні Мацуока пры сьвечаны спробам затрымаць прызнаньне СССР Злучанымі Штатамі. Паводле найўных весткаў, Мацуока паведаміў дзяржаўны дэпартамэнт, што ўся нарожная ў адносінах да ПАЗШ грамадзкая думка Японіі разглядала-б прызнаньне, як простае дзеяньне супроць Японіі. Дарадчыкі Хэла прадбачылі, што Японія зробіць падобнае прадстаўленьне і таму перасьцярога Мацуока не зьявілася для іх нечаканасьцю, аднак, Хэл быў, як відаць, некалькі зьдзіўлен і невядома які ўплыў аказаў візыт Мацуока на пытаньне аб прызнаньні.

Зварачае на сябе ўвагу тое, што ў часе візыту Мацуока ў Вашынгтоне, заўсёды варожая да СССР «Вашынгтон пост» пісала: «Прызнаньне Савецкага саюзу асабліва небясьпечна ў сучасны момант. Японія баіцца як Расіі, так і ПАЗШ. Японія растлумачыла-б прызнаньне, як адзна ку таго, што паміж ПАЗШ і СССР дасягнута таемная згода супроць Японіі. Гэта магло-б мець сваім вынікам нечаканы напад на Савецкі саюз ці разрыў з ПАЗШ, або і тое і другое разам».

12-дзенная галадоўка палітзьняволеных львоўскай турмы

ВАРШАВА, 8. У Львове гэтымі днямі скончылася 12-дзённая галадоўка палітычных зьняволеных у мясцовай турме «**Брыгіткі**». Галадоўка выбухнула ў адказ на рэпрэсіі турэмных уладаў у адносінах да палітзьняволеных, якія належылі да камэндатуры 18 сакавіка—у дзень МОПР'у. Актыўныя ўдзельнікі галадоўкі былі збіты, скатаваны, над імі зьдзекваліся. **Ігар Міхальчук** украінец, які зьяўляўся старшынёй камуны палітзьняволеных, быў зацягнут турэмшчыкамі ў ванну. Яго некалькі раз пагружалі ў гарачую і халодную ваду, а пасьля выкінулі ў мокрай бялізьне ў карцэр. **Міхальчук** захварэў запаленьнем лёгкіх і праз некалькі дзён памёр.

Падрабязнасьцяй аб ходзе галадоўкі няма, у сувязі са строгай цэнзурай усіх лістоў, якія пасылаюцца з турмы. **Ходзяць упартыя чуткі, што апрача Міхальчука памерла яшчэ дзесяць палітзьняволеных,** якіх зьбівалі ў турме.

Па прыкладу германскіх фашыстаў

Паход супроць кампартыі Чэха-Славакіі

ПРАГА, 6. У Чэха-Славакіі падрыхтоўваецца ўдар па кампартыі і рэвалюцыйных прафсаюзах. Пазаўчора суд прысудзіў да аднаго году строгага турэмнага зьняволеньня выданую ўладам камдэпутатку **Кун** за ўдзел у рабочай дэманстрацыі, якая адбылася тры гады таму назад. У бліжэйшыя дні ў парляманцкую камісію ўносіцца прапанова аб выдачы суду **16 камдэпутатаў**, з якіх пяць па абвінавачаньні ў дзяржаўнай здрадзе (**Готвальд, Запатоцкі, Грушка, Штэрні і Чыжынская**).

У гэтым паходзе супроць кампартыі выключную актыўнасьць праяўляюць сацыял-фашысцкія партыі. Так, «**Права ліду**» абяцае любой цаной палажыць канец посьпехам кампартыі. У буржуазным друку стаіць нясьціхаемае выцьцё.

Гэты паход супроць кампартыі невыпадкова супадае з момантам падрыхтоўкі partv законапраектаў, якія пагаршаюць і без таго цяжкае становішча беспрацоўных і шырокіх працоўных мас Чэха-Славакіі (пагаршэньне становішча кватэранаймальнікаў, скарачэньне дапамогі па беспрацоўі на 30 з лішнім процантаў і інш.). У прыватнасьці, распрацоўваецца новы парадак выдачы дапамог беспрацоўным, пазбаўляючы права на дапамогу ўсіх беспрацоўных, якія далучаюцца да «безадказных арганізацый» (г. зн. да рэвалюцыйных прафсаюзаў). З усіх канцоў Чэха-Славакіі на імя камфракцыі чэха-славацкага парляманту толькі на працягу некалькіх апошніх дзён паступілі сотні рэзалюцый пратэсту, прынятых на рабочых і сялянскіх сходах, пакрытых звыш 5.000 подпісаў. Да пратэсту далучаюцца таксама многія рэфармісцкія рабочыя.

Разгром Шуцбунду па ўсёй Аўстрыі

Сацыял-дэмакратыя ідзе на ўступкі

ВЕНА, 9. У Вене і па ўсёй **Аўстрыі** разгром арганізацыі Шуцбунду ідзе поўным ходам. Узброеныя атрады жандармэрыі займаюць памяшканьні муніцыпалітэтаў, якія знаходзяцца пад уплывам сацыял-дэмакратаў, муніцыпальныя прадпрыемствы, рабочыя дамы, а таксама робяць павальныя вобыскі ў дамох і падвалах. У **Кнітэльфэльдзе** канфіскаваны нібы 3 кулямёты. З кулямётаў таксама нібы знойдзены пры вобыску ў **Лісінгу** і **Вінэр-Нэйштаце.** Сёньня ўначы ў 9-м раёне гораду **Вены** пры вобысках нібы знойдзена 4 кулямёты. Нібы знойдзены таксама сотні вінтовак, бомбы і розная амуніцыя.

Сацыял-дэмакратычная партыя пастаўленая перад альтэрнатывай усеагульнай забастоўкі ці адступленьня, — працягвае адступаць. У **Вене** арыштавана звыш 200 членаў Шуцбунду. Напружанасьць унутры-палітычнай абстаноўкі ўзмацняецца катастрофічным паглыбленьнем фінансавага крызісу.

За нашэньне камуністычнага значка--9 месяцаў турмы

БЭРЛІН, 9. «Бэрлінэр Бэрзэн Цэйтунг» паведамляе аб радзе прысудаў, вынесеных у Германіі надзвычайнымі судамі. У **Браўншвэйгу** надзвычайны суд прысудзіў рабочага **Функе да 6-месячнага турэмнага зьняволеньня** за нашэньне камуністычнага значка. Да аналёгічнай кары прысуджан таксама другі рабочы, які раскідаў на вуліцы лістоўкі. На тым-жа падставе надзвычайнага суда **да 9 месяцаў** турэмнага зьняволеньня быў прысуджан яшчэ адзін рабочы, які насіў пад каўнерыкам піджака камуністычны значок. Надзвычайны суд у **Каселі** прысудзіў **да аднаго году і трох месяцаў** турэмнага зьняволеньня члена партыйнага цэнтру слухачага **Юрыса**, у прыватным лісьце якога ў Н'ю-Ёрк былі нібы абразьлівыя выразы па адрасу ўраду Гітлера.

РЭВАЛЮЦЫЙНЫЯ ВЫСТУПЛЕНЬНІ ПРЫЗЫЎНІКОЎ У ПОЛЬШЧЫ

ВІЛЬНЯ. Рост рэвалюцыйнага руху ахапляе ўсё шырэйшыя масы працоўных Польшчы. Ня гледзячы на ўсю дамагогію сацыял-фашыстаў, на ўсе іх імкненьні зламаць барацьбу пралетарыяту супроць фашызму, рабочыя і працоўнае сялянства ўсё больш пераконваюцца, што адзіны шлях выхаду з сучаснага становішча — гэта арганізаваная барацьба рабочых сялян з капіталістамі і сацыял-здрадніка мі розных масьцей.

Хваля масавых забастовак у прамысловасьці па ўсёй Польшчы, забастоўкі батракоў у сельскай гаспадарцы і баявыя рэвалюцыйныя выступленьні сялян цэлых паветаў супроць памешчыкаў, кулакоў і фашыстаў выразна сьведчаць аб гэтым. Мападыя рабочыя і сяляне, якіх набіраюць у армію для праходжэньня вайсковай службы, добра ведаюць чые правы прызначана абараняць польская армія і супроць кага будзе яна накіравана ў часе ваенных падзей. З якой ахвотай рабочыя і працоўныя сяляне ідуць адбываць вайсковую службу, сьведчаць выступленьні навабранцаў, якія адбываюцца кожны год у часе прызыву.

Як паведамляе «Дзеньнік Віленскі», цягнік, які ішоў з навабранцамі з Варшавы ў Вільню, спазьніўся на 3 гадзіны. Спазьненьне цягніка адбылося з прычыны выступленьняў ехаўшых у вайсковыя часьці навабранцаў. Навабранцы пачалі ў цягніку сьпяваць рэвалюцыйныя песьні, за што варта, якая суправаджала цягнік, хацела арыштаваць некалькі навабранцаў. Абураныя навабранцы не далі арыштаваць сваіх таварышоў. Варта паведаміла аб гэтым уладам Беластоку, Малкіна і Горадні (шлях сьледваньня цягніка). У часе астаноўкі на гэтых станцыях цягнік акружылі прыгатаваныя атрады войска, паліцыі і жандармэрыі і пачалі рабіць арышты перадавых навабранцаў.

Навабранцы аказалі супраціўленьне. У выніку адбылася бойка паміж навабранцамі і атрадамі жандармэрыі і паліцыі. Як піша газэта, усе шыбы ў вагонах былі выбіты. Хуткая дапамога адвезла параненых навабранцаў у горад.

На станцыі Горадня цягнік быў акружан моцным атрадам войска, які суправаджаў навабранцаў да самай Вільні. У Вільні прышоўшы цягнік акружылі атрады войска і паліцыі, высадзілі з цягніка навабранцаў, многіх з іх арыштоўваючы. Арыштаваных пад моцнай вартай адправілі ў казармы.

З прычыны апошніх падзей з прызыўнікамі, — піша «Кур'ер Віленскі»,— урад выдаў загад, каб цягнікі, у якіх будуць ехаць у прызначаныя гарады навабранцы, ахоўваліся спэцыяльнай вартай, назначэньне якой — душыць рэвалюцыйныя выступленьні прызыўнікоў.

Масавыя вобыскі і арышты ў сувязі з першым мая

ВІЛЬНЯ. Віленская манархічная газэта «**Слово**» паведамляе, што ў сувязі з надыходзячым міжнародным сьвятам рабочых — Першае мая ў Варшаве адбыліся масавыя вобыскі і арышты. 7 красавіка ноччу паліцыя зрабіла налёт на рабочыя кварталы і арыштавала 116 **ЧАЛАВЕК.** Таксама адбываюцца масавыя арышты і на правінцыі, асабліва на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Так у паветах **СЬВЯНЦЯНСКІМ, ПАСТАЎСКІМ, БРАСЛАЎСКІМ І ДЗІСЬНЕНСКІМ** адбыліся масавыя вобыскі і арышты сярод працоўнага сялянства. Шмат сялян арыштавана. У мястэчку **ВІДЗЫ**, Браслаўскага павету, зроблены масавыя вобыскі, арыштавана 18 чалавек.

Опэрны тэатр патрабуе дапамогі!

Пастановай сакавіцкага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б па пытаньнях культурна-нацыянальнага будаўніцтва, студыя опэры і балету была рэарганізавана ў Беларускі дзяржаўны тэатр опэры і балету. Тэатр за два з паловай гады існаваньня сваімі пастаноўкамі «Кармэн» і інш. даказаў сваю здольнасьць быць сапраўды масавым дзяржаўным тэатрам. Між тым, ня гледзячы на пастанову Цэнтральнага Камітэту нашай партыі, на пастанову СНК аб забесьпячэньні росту і разьвіцьця дзяржаўнага опэрнага тэатру, апошні зараз апынуўся ў такім становішчы, у якім немагчыма ніякая нармальная работа. Проста нажучы, становішча, у якім апынуўся тэатр, ПАГРАЖАЕ ЗРЫВАМ УСЁЙ ЯГО РАБОТЫ.

У выніку агіднейшых едносін да тэатру з боку былога апартуністычнага кіраўніцтва Наркамасьветы, тэатр зараз НЯ МАЕ НАВАТ ПАМЯШКАНЬНЯ, ня мае самых неабходных матар'ялаў для новых пастановак, ня мае мінімальных умоў для нармальнай работы сьпеваkoў-салістаў, хору і балету.

Ранейшае кіраўніцтва Наркамасьветы давяло тэатр да таго, што яму пры ходзіцца працаваць у двух капідорах польскага дзяржаўнага тэатру.

Больш таго. Ня гледзячы на пастанову камісіі пры СНК БССР ад 31 сту дзеня 1933 г. (старшынёй камісіі быў тав. Галадзед), якая пастанавіла даць на разгортваньне опэрнага тэатру 325 тыс. руб. датацыі на 1933 год, ня гледзячы на тое, што па пастанове камісіі пры Наркамасьвеце ад 9 сакавіка 1933 г. каштарыс тэатру быў зацьверджан ў суме 325.000 руб. датацыі,—ня гледзячы на гэта, РОЎНА ПРАЗ МЕСЯЦ Наркамасьветы ў асобе тав. БЯЛУГІ раптам зьмяніў сваю-ж пастанову; 9 красавіка г. г. скараціў на калегіі Наркамасьветы датацыю тэатру да 50.000 руб.

На чым грунтавалася такая пастанова калегіі Наркамасьветы? Яна грунтавалася на тым, што тэатр павінен выйсьці са становішча шляхам павялічэньня прыбытковай часткі, шляхам павялічэньня колькасьці опэрных пастановак эвыш пляну.

Мы пытаемся, якім чынам можа опэрны тэатр ня толькі павялічыць колькасьць пастановак, але і наогул выканаць свой плян у той час, калі ён на сёньняшні дзень ня водае калі і дзе ён будзе даваць свае паказы? Хіба-ж невядома Наркамасьветы, што тэатр ня мае памяшканьня ня толькі для паказаў, але нават і для падрыхтоўкі пастановак?

Дырэкцыя тэатру разам з калектывам правяла вялікую работу па рэарганізацыі студыі ў тэатр. Зараз тэатр рыхтуе новыя пастаноўкі «Апрычнікі» («Царская нявеста»), «Яўгені Анегін» і балет «Чырвоны мак». Гэтыя пастаноўкі ня могуць рыхтавацца з нічога. Яны патрабуюць пэўнай сцэны, пэўнага абсталяваньня. Між іншым, нават будаўнічых матар'ялаў для канструкцый і тых няма куды тэатру завезьці. Няма памяшканьня для дэкарацый. Больш таго, гэтыя новыя пастаноўкі патрабуюць пашыўкі аплікай колькасьці вопраткі, але ні памяшканьня, ні матар'ялаў для гэтай мэты няма, хаця дырэкцыя дзесяткі разоў абівала парогі Наркамасьветы, дабіваючыся хоць якой-небудзь дапамогі ў справе забесьпячэньня тэатру матар'ялямі для вопраткі.

Маладому опэрнаму тэатру патрэбна асабліва дапамога, як спэцыфічнаму тэатру, патрабуючаму значна большай колькасьці абсталяваньня, дапаможных матар'ялаў і г. д. Гэтай дапамогі ранейшае кіраўніцтва Наркамасьветы не аказвала.

Па пляну тэатр павінен распачаць свае паказы не пазьней 20 мая і працаваць да 1 верасьня, у сувязі з ад'ездам БДТ-1. Але і тут тэатру ставяцца палкі ў калёсы. Сам тав. БЯЛУГА (намесьнік НКА) санкцыянаваў аддаць будынак, які прызначаўся для опэрнага тэатру (з 20 чэрвеня па 15 ліпеня), для іншых мэт. Мы пытаемся, на якіх падставах дагэтуль ігнаруецца опэрны тэатр, як гэта было пры былым апартуністычным кіраўніцтве Наркамасьветы?

Цяперашняе кіраўніцтва Наркамасьветы павінна выправіць памылкі ранейшага. Павінна прыняць неадкладныя меры да забесьпячэньня опэрнага дзяржаўнага тэатру неабходным памяшканьнем, неабходным матар'ялямі для новых пастановак, над якімі тэатр зараз працуе.

Брыгада «Зьвязды»:
ВОЛІН,
СТАНЕЦКІ.

Падрыхтоўка да 1 мая

Для абслугоўваньня прамысловых цэнтраў БССР у дні першамайскіх сьвят, ДАМЭЦ арганізуе 19 мастацка-музычных брыгад з артыстаў і музыкантаў, якія запрашаюцца з Масквы, Ленінграду, Украіны.

Шэфарганізацыі намецілі арганізацыю 12 канцэртаў у часьцях Чырвонай армії.

Брыгады выедуць таксама ў раёны для абслугоўваньня МТС, калгасаў і саўгасаў.

Аднавіліся міжгароднія аўтабусныя зносіны

Аднавіліся міжгароднія аўтабусныя рэйсы Менск—Чэрвень праз Сьмілавічы. У бліжэйшы час пачнуць курсаваць паштова-пасажырскія аўтабусы па лініі Менск—Лагойск і Самахвалавічы. У кожным аўтабусе 9 пасажырскіх месц.

Выдача пашпартоў па Менску

За 8-га красавіка выдана 888 пашпартоў. Працавала 10 пунктаў. Усяго з пачатку пашпартызацыі выдана 4.434 пашпарты.

Хроніка

★ **Чатыры здраўніцы для асьветнікаў** Беларусі па 200 месц кожная будуцьця ў Менску, Гомелі, Магілеве і Віцебску.

★ **Клінікерам будуць сёлета забруківаны** вуліцы Ленінградзкая, Сьвярдлоўская і Валадарскага; брушчаткай— Савецкая ад рагу Сьвярдлоўскай да дзяржаўнага польскага тэатру, ад рагу Ленінскай да вуліцы Энгельса, і Інтэрнацыянальная вуліца. 11 вуліц панова будуць перабруківаны і 8 пакрыты булыжным камнем.

★ **339 кіноперасовак абслугоўваюць** МТС, калгасы і саўгасы БССР.

★ **100 зоатэхнічных пунктаў** арганізаваны пры раённых жывёлагадоўчых фермах Беларусі.

★ **Сэкцыі па летніх відах спорту**— лёгкай атлетыцы, валейболе, волі і інш. арганізуюцца пры ўсебеларускім стадыёне.

★ **Водныя станцыі** у Віцебску, Гомелі, Полацку, Бабруйску і Магілеве адкрываюцца да летняга сэзону ВОФКВ.

★ **18 брыгад шэфтавярства** рамантуюць інвэнтар у падшэфных калгасах Менскага раёну.

Па БССР

АНБ да 15-годзьдзя з дня абвяшчэньня БССР

1 студзеня 1934 году спаўняецца 15 год з дня абвяшчэньня БССР. У сувязі з гэтым прэзыдыум Акадэміі Навук Беларусі выканаўчы рад мерапрыемстваў. У сьнежні склікаецца спэцыяльная сэсія, прысьвечаная юбілею. На сэсіі будуць прачытаны даклады на тэмы: «Клясавая барацьба ў БССР за 15 год»—тав. Горын, «15 год дыктатуры пралетарыяту ў БССР»—тав. Канаплін, «Эканамічнае разьвіцьцё БССР за 15 год»—тав. Домбаль, «Ленінская нацыянальная палітыка ў БССР»—тав. Вальфсон і інш.

Да гэтага часу рыхтуецца выпуск спэцыяльнага зборніка навуковых прац акадэміі. Адказным рэдактарам зборніка вызначан прэзыдэнт акадэміі тав. Горын.

Масаваму сэктару акадэміі даручана выпусьціць сарэю папулярных брашур, прысьвечаных гадавіне і распрацаваць канкрэтны плян масавых дакладаў, якія будуць арганізаваны акадэміяй у буйнейшых цэнтрах БССР.

У маі ў Менску склікаецца чарговая сэсія Акадэміі навук Беларусі.

Сэсія абмяркуе пытаньні аб праблеме Вялікага Дняпра на тэрыторыі БССР, аб выбарах новых акадэмікаў і зацьвер дзіць статут акадэміі.

Майская сэсія Акадэміі Навук

У маі ў Менску склікаецца чарговая сэсія Акадэміі навук Беларусі.

Сэсія абмяркуе пытаньні аб праблеме Вялікага Дняпра на тэрыторыі БССР, аб выбарах новых акадэмікаў і зацьвер дзіць статут акадэміі.

З дакладам аб праблеме Вялікага Дняпра выступяць акадэмікі т. т. ДОМБАЛЬ і ПЯТРОВІЧ.

Для прыняцьця ўдзелу ў рабоце майскай сэсіі акадэміі навук запрашаюцца прадстаўнікі Дзяржпляну СССР і Наркамводу.

Разьмеркаваньне санаторна-курортных месц

Прэзыдыум ЦСПСБ зацьвердзіў пляц разьмеркаваньня пуцёвак у дамы адпачынку, санаторыі і на курорты для членаў прафсаюзаў. Аграмадная значная колькасьці месц, якія будуць разьмеркаваны сярод рабочых бясплатна, Белкурортбюро атрымала для продажу прафсаюзам на курорты ўсесаюзнага значэньня 1.424 санаторных месцы і 1.013 курсовак, на курорты Украіны 175 месц і на курорты і дамы адпачынку Крыму—1.500 месц.

Прэзыдыум ЦСПСБ прапанаваў наркамату аховы здароўя прапусьціць у гэтым годзе праз свае санаторыі «Беларуйпічкіна» і «Чырвоны Кастрычнік» вторых з агульнай колькасьці ня менш 35 проц. рабочых.

Месцы ў дамы адпачынку, санаторыі і курорты ў першую чаргу павінны прадастаўляцца ўдарнікам, кваліфікаваным рабочым, членам прафсаюзаў, якія ня маюць парушэньняў працдысцыпліны.

ЦСПСБ папярэдзіў усе ЦП саюзаў і ФЗК, што яны ацэнуць поўную адказнасьць за выкарыстаньне пуцёвак.

Вінаватыя ў выдачы рабочых пуцёвак іншым катэгорыям будуць прыцягнуты да крымінальнай адказнасьці.

1-га ліпеня—пуск гомельскай мэханізаванай гуты

У Гомелі заканчваецца будаўніцтва буйнейшай у БССР мэханізаванай гуты. Тэрмін пуску вызначан Наркамлёгпрамам 1 ЛІПЕНЯ 1933 ГОДУ. Прадукцыйнасьць заводу—30.000 тон ваконнага шкла ў год, або ў паўтары разы больш, чым даюць цяпер усе гуты БССР.

Гута абсталявана 25 машынамі аўтаматамі «Фурко». Агульны кошт будаўніцтва 18.600 тыс. руб.

Паведамленьні

— ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 15 красавіка г. г., у 10 гадз. раніцы, у г. Ветка будзе працаваць выязная ПТ ЦКК КП(б)Б па разгляду партпогпраў Веткаўскага раёну. Выклікаюцца наступныя т. т. на 15-IV—1933 г. у Ветку: Усхонаў П. Д., Лейчакоў, Гарбачоў А. М., Медзялянаў П. Я., Гораў Ф. Ул., Казлоў П. Н., Фешчанка Д. І., Захараў А. Б., Вераб'ёў Н. Ш., Буруляў І. Т., Грышчанка Я. С., Іванаў Кір'ян, Гершман А. Д., Марчунаў П. І., Капцераў В. Ф., Манькоў Т. Я., Радзькоў, Межэнаў А. С., Пудзеаў З. Ф., Філімонаў Я. А., Копчыц Ц. Р., Дзегцярэў П. Я., Габрыкоў А. Д. Выпішчаманнёжным т. т. неабходна прадставіць на ПТ ЦКК характарыстыкі ячэек аб іх апошняй працы.

— ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 15 красавіка, у 10 гадз., у Хойніках будзе працаваць выязная ПТ ЦКК КП(б)Б па разгляду партпогпраў Хойніцкага і Брагінскага раёнаў. Выклікаюцца наступныя т. т. на 15 красавіка, у 10 гадз. раніцы: Па Хойніцкім раёне: Кандрусевіч Л. П., Карась А. Г., Лазебнікаў Я. Г., Шынкаренка П. А., Гарбуша Ц. Н., Блюмкін Б. С., Хвешчанка І. Н., Цихага А. В., Зялёнка Д. А., Кізікоў П. Г., Бандаренка С. Я. Па Брагінскім раёне: Краўчанка В. Я., Дарафееў Г. І., Коўша А. А. Да дня разгляду спраў таварышам, якія апелююць, неабходна падаць характарыстыку п/яч. аб апошняй іх працы.

— ПК ЦКК КП(б)Б просіць т. Іванова Петра Іванавіча зьявіцца ў ПК ЦКК Бел., або паведаміць свой адрас, месца жыхарства і работы—Менск, Савецкая, 55, 3 паверх, 18 пакой. Просьба да ўсіх партарганізацый, якія ведаюць месца знаходжаньня памянёнага таварыша, паведаміць ПК ЦКК КП(б)Б.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Першы Дзярж. Тэатр (БДТ-І)
СЁНЬНЯ ПЛАЦДАРМ
ПАЧАТАК у 8 гадз. веч.

Чырв. Зорка Каса—ад 1 г. дня. Новая савецкая мастацкая кінадрама. Шукаю пратэкцыю

Дзіцячы гукавы КІНО-ТЭАТР Касс з 12 г. дня. З 1 красавіка новы мастацкі фільм РАЗАМ з БАЦЬКАМІ

„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" Каса—з 2 г. дня ЗАКОН І АБАВЯЗАК (АМОК) драма ў 6 ч.

ПРАЛЕТАРЫ Мастацкі фільм РАЗЛОМ

„СПАРТАК" Каса—ад 2 г. 30 х. Замежны мастацкі фільм ДЗЯЎЧЫНА-БЯЗБОЖНІЦА драма ў 10 частках.

Беларускі Дзяржаўны завочны мэдычны інстытут
абвяшчае
набор мэдпрацаўнікоў
на 1-шы курс на наступныя факультэты:
1) ЛЕЧАВА-ПРАФІЛЯКТЫЧНЫ—120 чал.,
2) СТОМАТОЛЁГІЧНЫ—30 чал.,
3) САНІТАРНА-ПРАФІЛЯКТЫЧНЫ—90 чал.
4) АХМАТДЗЕТ—60 чал.
Тэрмін навучаньня—4 гады.
Умовы прыёму: агульныя правілы прыёму ў ВНУ і згодна пастановы ЦВК СССР ад 19-IX-1932 году.
У інстытут прымаюцца асобы ад 18 да 40 год.
Усе ахвяўні аб прыёме атрымаць у райгрупкоме саюзу і дырэкцыі інстытуту (Менск, Дом Ураду, НК Аховы Здароўя, Завочны Мэд. інстытут); па адрасу дырэкцыі належыць накіраваць анкету з дакумантамі.
Прыём заяў да 1 мая 1933 году.
Дырэкцыя завочнага мэд. інстытуту.

Рэдакцыі газэты „ЗЬВЯЗДА"
ПАТРЭБНЫ
кваліфікаваны машыністкі,
Зварачацца: Савецкая, 63, 3-ці паверх.

СЛАВА СЬВЕТУ
СЛАВА СЬВЕТУ
НОВЫ ГУКАВЫ КІНО-РАМАН
СЛАВА СЬВЕТУ
СЛАВА СЬВЕТУ
НОВЫ ГУКАВЫ КІНО-РАМАН

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР
14 красавіка
адзіны вечар
САРЫ ФІБІХ
пры ўдзеле Н. В. БЖУСКАГА
У праграме: песьні, балады, паэмы, навэлы.
Білеты ў рабочай касе з 12 да 2 і з 4 да 6 г. і ў касе тэатру з 12 да 2 і з 4 да 9 г. веч.
Па калектыўных заяўках — скідка.
Пачатак у 9 гадз. вечара.

Даводзіцца да ведамаўсіх лекавых устаноў Беларусі,
што хворыя з раёнаў на стацыянарнае лячэньне клінік гарадку па ўнутраных, хірургічных, скура-венэрычных і гінекалёгічных хваробах
могуць быць накіраваны
выключна пасьля папярэдняга запытаньня
адпаведнай клінікі або эвакопрыёмніка гарадку.
Дырэкцыя.

Друкуецца і гэтымі днямі
ПАСТУПІЦЬ У ПРОДАЖ
№ 3-4 „БАЛЬШАВІКА БЕЛАРУСІ"
З НАСТУПНЫМ ЗЬМЕСТАМ:
ПЕРАДАВЫ.—Зробім усе калгасы бальшавіцкімі.
В. ЖАБРОЎСКІ —Задачы масавай літаратуры ў БССР.
М. ЛЫТКІН.—Да выніку аб'яднаньня лютаўскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б.
П. ГОРЫН.—Карл Маркс і сусьветна-гістарычнае значэньне марксізму-ленінізму.
С. ВАЛЬФСОН.—Карл Маркс—заснавальнік навуковага камунізму.

Белканторы Дзяржбанку
ПАТРЭБЕН
на сталую працу
юрысконсульт.

На падставе пастановы прэзыдыуму Белкаапсаюзу ад 25 красавіка 1933 г.
МЕНСКАЕ ГАРАДЗКОЕ АБ'ЯДНАНЬНЕ ПА ГАНДЛЮ ХЛЕБАМ ГАРКААПХЛЕБ
з 16 красавіка г. г.
ЛІКВІДУЕЦЦА
з перадачай прадпрыемстваў і гандлёвай сеткі МГРК і ЗРК.
Прапануецца ўсім арганізацыям і асобам, маючым якія-небудзь пратэнзіі да гаркаапхлебу, прад'явіць іх ліквідкому ў 2-тыднёвага тэрміну са дня апублікаваньня.
Пасьля 25 красавіка паступлўшыя пратэнзіі разглядацца ня будуць
АДРАС ЛІКВІДКОМУ: МЕНСК, вул. РОЗЫ ЛЮКСЭМБУРГ, 9.
ЛІКВІДКОМ.

Працягваецца падпіска на 1933 г. на „ОСТЫ", „ВЕСТЫ", „СПРАВОЧНІК РАЦЫОНАЛІЗАТОРА" і „ВЕСТНІК СТАНДАРТЫЗАЦЫІ" і „ОРГАНІЗАЦЫЯ УПРАВЛЕНЯ".
ДА ВЕДАМА прадпрыемстваў і арганізацый!
УСЕ выдаўні выдавецтва „СТАНДАРЦІЗАЦЫІ І РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫІ" паводле генэральнага дагавору
ПЕРАДАДЗЕНЫ
для распаўсюджваньня па БССР—Беларускаму аб'яднаньню культтавараў („БАКТ'у")
ПАДПІСКА
на „ОСТЫ", „ВЕСТЫ", „СПРАВОЧНІК РАЦЫОНАЛІЗАТОРА", альбом „РЭКАНСТРУКЦЫЯ ГАРАДДОЎ" і часопісі: „ВЕСТНІК СТАНДАРТЫЗАЦЫІ" і „ОРГАНІЗАЦЫЯ УПРАВЛЕНЯ"
ПРЫМАЕЦЦА в Менску: Ленінская, 15, кніжны магазын „БАКТ" і кнігарням „БАКТ"— у Гомелі—Савецкая, 18 і Віцебску—Замкавая, 7.
Звонце па тэлефону 20-871, да вас будзе накіравана супрацоўнік для прыёму і афармленьня падпіскі.
Продаж і прыём заказаў на кнігі выпускаецца ўсякі кнігарнямі „БАКТ'у" і райспажыўсаюзаў.
БАКТ.
ПРЫМАЕЦЦА ПАДПІСКА таксама на ўсе „ОСТЫ" і „ВЕСТЫ", выпушчаныя да 31-XII—32 г.

У аддзел аб'яў званеце па тэлефону 21-358

УМОВЫ ПРЫЕМУ

ў інстытут асьпірантуры БАН у 1933 г.

1. У ліх асьпірантаў прымаюцца члены КП(б)Б і ЛКСМВ і беспартыйныя рабочыя і калгасьнікі, якія лепш скончылі ВНУ або ВТНУ, былі высунуты гэтымі ўстановамі для навуковай працы, маюць ня менш 3-х гадоў практычнага стажу па партыйнай, камсамольскай, савецкай, прафсаюзнай і гарадзкай рабоце і правялі сябе непахісным барацьбітамі за генэральную лінію партыі. Узрост паступаючых не павінен быць вышэй 35 гадоў.

2. Прыём адбываецца на наступныя аддзяленьні: філёзофскае, гісторычнае, эканамічнае, літаратурна-мастацкае, мовазнаўчае, савецкага будаўніцтва і права, біялёгічнае, геалёгічнае, глебазнаўчае, хімічнае, фізыка-матэматычнае, псыханэўралёгічнае і па яўрэйскай, польскай, літоўскай і латыскай пралетарскіх культурах.

3. Паступаючыя трымаюць іспыты па ленінізму, гісторыі УсеКП(б) і КП(б)Б, гісторыі Камінтэрну, дыялектычным матэрыялізьме, палітэканоміі (на прыродазнаўчыя аддзяленьні палітэканомія не абавязкова), па адной з замежных моў (нямецкай, францускай, ангельскай), а таксама па дысцыпліне, абранай паступаючым для сваёй спэцыяльнасьці.

4. Жадаючыя паступіць у асьпіранты павінны ў сваёй заяве паказаць выбраную ім спэцыяльнасьць і прыкласьці да заявы наступныя дакуманты: а) **камандыроўку**—члены партыі і камсамольцы—ад сваіх ГК і РК, а беспартыйныя—ад адпаведных прафсаюзных і грамадзкіх арганізацый; б) **характарыстыку** ад камандыруючай арганізацыі; в) засьведчаную анкету